Газета для вас



Цана па падпісцы — 15000 руб.
Цана ў розніцу — 25000 руб.

ІВАЦЭВІЧЫ-БАРАНАВІЧЫ-БЯРОЗА-ПРУЖАНЫ

№43(201)23–29 кастрычніка 1999 г. | ГРАМАДСКАЕ НЕЗАЛЕЖНАЕ ВЫДАННЕ, ВЫХОДЗІЦЬ СА СТУДЗЕНЯ 1997 г. | Наш індэкс 63834

НАВІНЫ: ЧАС МЯСЦОВЫ

КОНКУРС "САМАЯ ОБАЯТЕЛЬНАЯ И ПРИВЛЕКАТЕЛЬНАЯ"



КАТЯ. По гороскопу Козерог. Мои увлечения — спорт (волейбол, футбол), музыка (окончила музыкальную школу). Нравятся "Иванушки интэрнэшнл".

В мужчинах ценю настоящее мужество, смелость и находчивость. Обожаю общение с людьми. Не представляю жизни без семьи, в одиночестве.

"У Василя" гуляли до утра

Производственное объединение "Березастройматериалы" провело презентацию комплекса столовой-ресторана "У Василя". Рабочие предприятия очень надеются, что этот комплекс снимет проблему обеденного питания и будет способствовать сохранению их здоровья.

Насколько оправдаются их надежды покажет время. Пока же многие из рабочих так и не поняли, что такое презентация, которую, кстати, транслировало местное кабельное телевидение. Показывали смиренные лица бывших березовских партийных бонз (теперь занимающих, конечно, другие должности). Они стояли со свечками в руках, и православный священник кропил одинаково водичкой и католиков, и иудеев, и православных.

Около 10 вечера основной публике (простому люду) предложено было разойтись, а избранной — остаться. И вот эта-то часть, в которую попали те же бывшие партийные бонзы, врачи, руководители почти всех заводов, некоторые председатели колхозов, директор, конечно, рыбхоза, разобраться в том, что же такое презентация, сумела. С вечера и до половины пятого утра было время, чтобы точно прояснить ситуацию.

Правда, ясности в головах у гуляющей элиты поутру не было. На заводах, в больницах, в колхозах определяли это просто: кто пришел на работу вовремя, тот с ясной головой ушел от "У Василя" в 10 вечера, а кто опоздал на полдня, тот ... ну сами понимаете.

Кстати, свое название "У Василя" столовая-ресторан, скорее всего, позаимствовала у директора ПО "Березастройматериалы" Василия Басалая. Ох, и умеет презентовать Василь Николаевич.

В. МОРОЗ.

г. Берёза.

ГОЛАС НАРОДА

Ці чыталі вы праект Саюзнага дагавора?

Як вядома, уладныя структуры Беларусі і Расіі прапанавалі сваім народам абмеркаваць праект Дагавора аб стварэнні Саюзнай дзяржавы. Прайшло ўжо каля двух тыдняў з часу апублікавання яго ў адной з цэнтральных газет і зараз, трэба лічыць, поўным ходам павінна ісці абмеркаванне гэтай дамовы ўсюды: у грамадскім транспарце, у працоўных калектывах, проста на вуліцах. Што ж, мы выйшлі на вуліцы райцэнтра Івацэвічы і пацікавіліся ў прахожых наконт таго, ці ўдзельнічалі яны ў такім абмеркаванні ці хаця б чыталі гэтыя самы Дагавор?



Галіна Васільеўна: Не, не чытала. І нават не слухаю па радыё і не гляджу па тэлевізару. Хаця б таму, што ад таго ж Беларускага тэлебачання патыхае такой нудой, што жыць не хочацца. Да таго ж, пра гэты саюз столькі гаварылася да гэтай пары, што няма цярпення слухаць адну і тую ж тарабаршчыну.



Уладзімір: Не чытаў. Ведаеце, сам жа прэзідэнт неяк сказаў, што нам, беларусам, няма сэнсу і патрэбы вывучаць гэты дагавор, бо мы ў свой час за яго галасавалі.

З другога боку, гэты праект, відаць, не такі важны, як выдаюць дзяржаўныя СМІ. Паглядзіце расійскія каналы — там аб праекце ні слова.



Вячаслаў: Я не чытаў і не збіраюся нават чытаць. Чаму? Ды не веру, што гэтыя інтэграцыйныя ініцыятывы да дабра давядуць. Сяброўскія адносіны з Расіяй, як і з іншымі суседзямі, трэба падтрымліваць, але лезці ў абдымкі да такой неспакойнай краіны было б памылкай, калі не здрадай. Там жа вайна ідзе!



Любоў Мікалаеўна: От, вы, маладыя, чытайце і галасуйце. Я ўжо напаўсляпая, каб за газетамі сядзець. Але часам па радыё, тэлевізару бачу, чую размовы пра гэтае аб'яднанне. Нам, старым, няма чаго да гэтага ўсяго чапляцца. Як улада скажа, то так яно і будзе. Маладых пытайце, маладых.



Сяргей: Я цікаўлюся праектам, наколькі дазваляе час. Якія адносіны? Даволі супярэчлівыя. Я вось не зусім разумею неабходнасць, так бы мовіць, грашовага аб'яднання. Калі мы страцім сваю грашовую адзінку, то якімі ж мы будзем суверэннымі? І ваенны дагавор выклікае пытанні. Што — ваяваць пойдзем? Пакуль што я ў роздуме, і канкрэтнай думкі на праект не маю.

У народ хадзілі А. ГОРБАЧ, А. ГАНЧУК (фота).

О МАРШЕ СВОБОДЫ

Я пастаянны ўдзельнік падобных акцый і, прызнаюся, такога масавага пратэсту людзей супраць рэжыму А. Лукашэнкі (дэманстрантаў было каля 30.000 чалавек) не бачыў ужо з 1996 года. У Мінск я прыехаў на цягніку, ніякі спецтранспарт людзей, падобных мне, не звозіў, як сцвярджаюць прапукашэнкаўскія СМІ. Поўным глупствам, калі не свінствам, можна лічыць тыя сцвярджэнні, што нам раздавалі даляры, гарэлку, што шэсце суправаджалася пагромамі, пажарамі. Згуртавала і сабрала на дэманстрацыю людзей нянавісць да існуючага рэжыму, які давёў людзей да галечы, які зневажае ўсё беларускае, груба парушае правы чалавека і іншыя агульначалавечыя нормы.

Я вельмі ўсцешаны, што супраць дыктатуры падымаецца моладзь, якая, урэшце рэшт, скіне ганебны рэжым, што Богам дадзеную свабоду, незалежнасць ёсць каму бараніць.

В. ГАРЧАКОЎ, жыхар г. Івацэвічы.

Х Х Х

19 октября МО "Гражданский форум" г. Пружаны провел опрос молодых людей в возрасте от 18—25 лет на улицах города. На вопрос "Ваше отношение к событиям, прошедшим в Минске 17 октября" ответили ровно 100 человек. Ответы были весьма интересными. 68 человек ответило, что идея была хороша и такой марш был нужен. Однако 54 человека из числа поддержавших отрицательно отнеслись к драке с милицией. 12 молодых людей ответило, что драка была в ответ на каждодневные исчезновения людей и на беспредел, творимый милицией. Противниками Марша Свободы были 28 человек, некоторые, к удивлению, из демократических организаций.

Безразличными оказались 4 человека, ответив, что им всё равно.

В. РАДИОНЧИК.

(Продолжение темы на 3-й стр.).

СЁННЯ Ў НУМАРЫ:

17 кастрычніка. Мінск. Марш Свабоды

Тысячы жыхароў і гасцей беларускай сталіцы, якія выйшлі на масавую грамадзянскую акцыю, заявілі ва ўвесь голас аб сваім жаданні "людзьмі звацца"...

3-я стар.

"Кто ответит за смерть моей дочери Оксаны?"



Врачебная ошибка оказалась роковой для четырнадцатилетней девочки.

4-я стар.

Паэт, які не любіць даваць інтэрв'ю

Развагі вядомага беларускага паэта Ніла Гілевіча пра час, культуру, нацыянальную свядомасць.

5-я стар.

"Пульс"



Тэматычная старонка, прысвечаная медыцыне і яе праблемам.

6-я стар.

Свае і чужыя

Лёс звычайнай вёскі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Успаміны тых, хто захаваў памяць пра яе падзеі, успаміны пра перажытае даносяць подых 40-х гадоў.

8-я стар.

Рэклама, гараскоп, TV-праграма

10-я, 11-я, 12-я стар.

НАВІНЫ РЭСПУБЛІКІ

Пачакаем 25 лістапада

Дагавор аб стварэнні Саюзнай дзяржавы можа быць падпісаны прэзідэнтамі Беларусі і Расіі 25 лістапада.

Такую думку выказаў намеснік старшыні камісіі па інфармацыйнай палітыцы і ўзаемадзеянню з грамадскімі аб'яднаннямі Парламенцкага сходу Саюза Беларусі і Расіі Валерый Драко 19 кастрычніка падчас пасяджэння "круглага стала" па пытаннях перспектыў саюзнай дзяржавы. Ратыфікацыя дагавора Дзяржаўнай Думай РФ, паводле яго ных слоў, магчыма ў адзін з апошніх дзён працы ніжняй палаты расійскага парламента, напрыклад, 3 снежня. У гэты ж дзень дагавор можа быць ратыфікаваны і парламентам Беларусі.

В. Драко паведаміў, што ўзначальваемая ім у Палаце прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі дэпутацкая група "Саюз" працягвае настойваць на тым, каб у Дагаворы аб стварэнні Саюзнай дзяржавы "былі канкрэтна прапісаныя два моманты". Размова ідзе пра прапанову беларускіх парламентарыяў вызначыць у дагаворы канкрэтныя тэрміны правядзення выбараў у саюзны парламент — напрыклад, на працягу квартала пасля падпісання дагавора прэзідэнтамі, — а таксама правядзення рэферэндуму, на які павінен быць вынесены праект Канстытуцыі саюзнай дзяржавы — на працягу паўгода пасля падпісання дакумента.

Новы прадстаўнік МВФ

Прэм'ер-міністр Беларусі Сяргей Лінг сустрэўся з Адальбэртам Кноблам — кіраўніком прадстаўніцтва Міжнароднага валютнага фонду (МВФ) у Літве і па сумяшчальніцтву ў Беларусі, які прадставіў прэм'еру свайго пераемніка на гэтай пасадзе Марка Хортана. Сам сп. Кнобл хутка пакіне Літву ў сувязі з пераходам на новую пасаду.

Нагадаем, што МВФ адазвала свайго пастаяннага прадстаўніка ў Беларусі ў 1996 годзе, пратэстуючы такім чынам супраць прамаруджвання рэформ у краіне.

Праект бюджэту на 2000 год

У Міністэрстве фінансаў Беларусі завяршаецца работа над праектам бюджэту на 2000 год. Чакаецца, што ў апошнюю дэкаду кастрычніка дакумент будзе разгледжаны на пасяджэнні Савета Міністраў і ў пачатку лістапада прадстаўлены кіраўніку дзяржавы.

Чарговы бюджэт краіны закліканы вырашыць у наступным годзе шэраг асноўных задач, сярод якіх — дасягненне фінансавай стабілізацыі, зніжэнне інфляцыі, забеспячэнне больш высокіх тэмпаў павышэння зарплаты ў бюджэтнай сферы ў параўнанні з рэальным сектарам эканомікі. Выконвацца бюджэт краіны 2000 года будзе, паводле слоў міністра, ва ўмовах больш жорсткай грашова-крэдытнай палітыкі, памяншэння аб'ёмаў эмісійных крэдытаў, зніжэння ўзроўню дзяржаўных расходаў.

Пацярпелі супрацоўнікі МУС

Паводле апошніх звестак прэс-цэнтра Міністэрства ўнутраных спраў Беларусі, у выніку сутыкненняў міліцыі з удзельнікамі "Маршу Свабоды" 17 кастрычніка ў Мінску пацярпелі 58 супрацоўнікаў праваахоўных органаў — яны атрымалі траўмы рознай ступені цяжкасці.

Пяць з іх былі шпіталізаваныя: трое ваеннаслужачых унутраных войскаў МУС і два супрацоўнікі органаў унутраных спраў. Паводле інфармацыі, атрыманай з Рэспубліканскага шпіталю МУС РБ, цяпер стан здароўя шпіталізаваных не выклікае небяспекі, трое з іх ужо выпісаны з бальніцы.

Што тычыцца астатніх пацярпелых супрацоўнікаў праваахоўных органаў, то, як паведамілі ў прэс-цэнтры МУС РБ, ім была аказана своечасовая медыцынская дапамога без шпіталізацыі.

(БелаПАН).

ПА СЛЯДАХ НАШЫХ ВЫСТУПЛЕННЯЎ

Арыштаваны двое

У нашай газеце за 24—30 ліпеня быў надрукаваны артыкул "Дапажыце знайсці забойцу сына", у якім гаварылася аб тым, што 22-гадовы жыхар г. Бярозы Максім Пяткевіч у сярэдзіне студзеня гэтага года быў знойдзены забітым у Івацэвіцкім раёне. Л. А. Пяткевіч, маці загінуўшага Максіма, расказала пра тое, што сын паехаў у Мінск здаваць залік (ён быў студэнтам БДУ) і не вярнуўся дамоў. Грошай вялікіх у хлопца не было, каштоўнасцей — таксама. Чаму ж здарылася нешчасце? Па факце забойства была ўзбуджана крымінальная справа. Увесь час праваахоўныя органы стараліся выйсці на след злачынцаў. І толькі некалькі дзён таму ў Бярозе арыштаваны два чалавекі, якія падазраюцца ў забойстве. У інтарэсах следства прозвішчы арыштаваных пакуль не называюцца.

НАВІНЫ: ЧАС МЯСЦОВЫ

Вынік ёсць

БЯРОЗА. Выніковымі аказаліся заявы ў райвыканкам і раённы цэнтр гігіены і эпідэміялогіі кіраўніцы раённай арганізацыі Беларускага жаночага руху "Адраджэнне Айчыны" спадарыні Тамары Шчапёткінай наконт якасці пітной і гарачай вады, пад якімі паставілі подпісы каля 70 жыхароў Бярозы ("Газета для вас" пісала пра гэта два тыдні таму). Вада з кранаў цячэ празрыстая і чыстая, што пацвярджаюць аналізы санітарных урачоў (хоць пакуль і ёсць усё ж невялікае перавышэнне нормы па жалезу). Аднак тое, што з цэнтра гігіены, а потым і з водаканалу прыходзілі браць пробы вады менавіта ў кватэру спадарыні Тамары, выклікае ў яе пэўныя сумненні: ці не былі праведзены нейкія работы толькі ў яе доме (ці нават пад'ездзе). А подпісы ж ставілі жыхары з усяго горада.

Тым не менш вынік ёсць. Хто стукаецца, таму адчыняюць.

С. РУСЕЦКІ.

Медаль художнику

БАРАНОВИЧИ. Одному из старейших художников Барановичей Константину Ивановичу Максимцову вручена высшая награда Союза художников Беларуси — медаль "За заслугі ў выяўленчым мастацтве". Он первый из плеяды творческих людей, чье творчество оценено так высоко.

Родители — убийцы

14 октября, в День матери, в Барановичах произошло такое ЧП, которое не укладывается в рамки нормального человеческого сознания. В 9 утра дворник нашел в мусорном контейнере труп новорожденного ребенка с перерезанным горлом. Кто бы вы думали подозревается в убийстве? Мама с папой, хоть и не хочется называть их так. Роды прошли на дому, а потом до изверга таким вот нечеловеческим способом избавились от ребенка. Оба они задержаны. Будем надеяться, что воздастся им по заслугам.

Г. СТРОЦКАЯ.

А скупы яшчэ заплаціць

Ацяпляльны сезон у нашым рэгіёне мае нейкія свае адметныя рысы. Канула ў мінулае сезонная рыса — 15 кастрычніка — дата, з якой пачынаўся ацяпляльны сезон. Бо толькі з 18 кастрычніка ў нашым рэгіёне пачалі ацяпляцца школы, садкі, бальніцы, каб дзеці, як самая прывілеяваная частка грамадства, не мерзлі. А вось тое, што дзеці ў садку, хай і ацяпляемым, спяць дзве гадзіны, а дома, у халодных, сырых кватэрах, 8—10 гадзін, мусіць, не занадта трывожыць абласное кіраўніцтва.

Так жылы сектар у Івацэвічах, Пружанах яшчэ днём 20 кастрычніка не ацяпляўся. Тое, што зэканомілі на паліве, адгукнецца на бальнічных лістках, на леках, якія дзяржава будзе вымушана выплаціць, выдаць хворым дзецям, іх бацькам. Ужо зараз у дзіцячых паліклініках павялічыўся паток хворых дзяцей. Скупы ж заўжды плаціць двойчы.

А. МІХАЛЕНКА.

КРЫМІНАЛ

Наеліся...

Вялікая непрыемнасць здарылася ў калгасе "Шлях Леніна" Баранавіцкага раёна. На ферме ў вёсцы Медзяневічы пачаўся масавы падзеж жывёлы. 55 кароў недалічыліся ў статку. Высветлілася, што падчас пасьбы зайшлі каровы на поле, дзе раслі цукровыя буракі, і наеліся іх так, што атруціліся. Давялося рагуль дарэзваць і везці на мясакамбінат. Супраць халатнага і безадказнага пастуха ўзбуджана крымінальная справа.

Г. СТРОЦКАЯ.

Злоўлены за руку

Жыхара в. Першамайская Бярозаўскага раёна У. І. Марозава затрымалі каля агароджы Бярозаўскага камбікормавага завода. Ён ляжаў на зямлі ў нецвярозым стане, а каля яго знаходзіўся мех з камбікормам. Непадалёку знойдзены яшчэ тры напоўненыя ім мяхі.

За крадзеж 133 кг камбікорму, неаднойчы судзімаму У. Марозаву, вызначылі пакаранне ў паўтара гады пазбаўлення свабоды.

С. РУСЕЦКІ.

За замах на жыццё

22-гадовы жыхар Пружан Віталь Бойка за замах на жыццё прыватнага таксіста прыгавораны судзейскай калегіяй абласнога суда да 15 гадоў калоніі ўзмоцненага рэжыму.

1 мая Віталь папрасіў прыватнага таксіста пакатаць па гораду і раёну, паабяцаўшы добра заплаціць. Потым скамандаваў везці яго на хутар. Па дарозе хлопец памкнуўся ўдарыць нажом таксіста, аднак вадзіцель перахапіў лязо.

Л. САШЫН.

АЛЁ, РЭДАКЦЫЯ?

Аплата залежыць ад класнасці

— Я працую ў калгасе "Косава" трактарыстам. Маю сярэднюю спецыяльную адукацыю (аграном). Як павінна аплачвацца мая праца?

У. РАБЧЭНЯ,

жыхар вёскі Заполле Івацэвіцкага раёна.

З гэтым пытаннем рэдакцыя пазнаёміла галоўнага спецыяліста па аплаце працы ўпраўлення сельгасхарчу Івацэвіцкага райвыканкама М. І. ЛЮШКЕВІЧА.

— У кожнай гаспадарцы распрацаваны і зацверджаны ўмовы аплаты працы калгаснікаў, — сказаў Мікалай Іванавіч. — Напрыклад, зарплата механізатара залежыць ад яго класнасці. У панацце класнасці уваходзяць і адукацыя, і стаж. За гэта абавязкова робіцца даплата. Кіраўнікі калгасаў найперш зацікаўлены ў спецыялістах высокага класа.

Так ва ўсякім разе павінна аплачвацца праца механізатараў. А як жа на самой справе на месцы гэта робіцца?

На пытанне рэдакцыі адказала і галоўны эканаміст калгаса "Косава" С. Г. КАСЮК.

— Аплата працы механізатараў вядзецца згодна з тарыфнымі стаўкамі, — падкрэсліла Святлана Георгіеўна. — Кожны трактарыст, напрыклад, мае дакумент, які выдадзены раённай камісіяй аб яго класнасці. На падставе гэтых "корачак" і робіцца дадатковае налічэнне да зарплаты. Улічваецца і стаж. Што ж тычыцца канкрэтна У. І. Рабчэні (а ён механізатар І класа), то яму налічваецца 20 працэнтаў за класнасць. Працуючы шмат гадоў у сельскай гаспадарцы, я не помню, каб мы плацілі трактарыстам за адукацыю.

АД РЭДАКЦЫІ. З адказаў спецыялістаў па аплаце працы можна зрабіць вывад, што адукацыя механізатара ўсё ж улічваецца. Маецца на ўвазе адукацыя спецыяльная. Трактарыст не можа добра апрацоўваць зямлю, не ведаючы агранаміі. Мінімум такіх ведаў яму даюць пры навучанні. Што ж датычыцца трактарыста, які яшчэ мае агранамічную адукацыю (хоць гэта яшчэ і рэдкасць), то такіх работнікаў, на наш погляд, трэба ўсяляк заахвочваць. У кожнай справе павінен быць спецыяліст высокага класа. Тады нашы аграрнікі не будуць вінаваціць надвор'е ў дрэнным ураджаі.

ЗДАРЭННІ

"Рабінзанада"-2 пенсіянеркі

Наша выданне ўжо давала інфармацыю аб тым, як 76-гадовая пенсіянерка з вёскі Магіліцы Івацэвіцкага раёна Лізавета Сямёнаўна Гегеня два дні прымусіла пахвалявацца вёску, калі пайшла па грыбы і заблудзілася ў лесе.

Нядаўна зноў прымусіла пахвалявацца жыхароў вёскі, сваіх родзічаў усё тая ж Лізавета Сямёнаўна. Пайшоўшы ў лес у нядзелю, яна выйшла ў аўторак да вёскі Козікі, што ў дваццаці-трыццаці кіламетрах ад яе роднай вёскі Магіліцы. Здзіўляе фізічная вынослівасць пенсіянеркі: апошнім часам стаяць надзвычай халодныя ночы, зусім не такія, як у час яе першай "рабінзанады" ў верасні.

"Газета для вас" выказвае радасць з нагоды таго, што лясныя паломніцтвы Лізаветы Сямёнаўны скончыліся шчасліва, але ўсё ж такі спадзяецца, што "рабінзанады" — 3, 4 або 5 больш не будзе...

РЫНКАВАЯ ПЛОШЧА

ШТО ПАЧЫМ?

Цэны на рынках нашага рэгіёна па стану на 21.10.99 г. (у тысячах руб. за адзін кілаграм):

	Івацэвічы	Баранавічы	Бяроза	Пружаны
Свініна	800—950	1млн.—1,3млн	1,2млн.	900—1,2млн
Сала салёнае	700	700—900	900	700—900
Алей (1 л)	550—600	450—600	500—600	500—550
Яйкі	200—220	200—240	300	200—220
Малако (3 л)	140	150	150	130
Тварог	150	240	200	150—170
Масла сметанк.	700	800	700	700
Цыбуля рэпч.	160	120—140	150—160	175
Капуста	40—50	40—50	50—60	70
Бульба	50	50—80	60	50—70
Памідоры	180	150—240	200—250	130—180
Морква	70	60—80	80—100	95
Буракі стал.	40—60	40—60	50—60	50—65
Перац	200	300	250—300	220—260
Яблыкі	180—500	120	200—300	100—360
Кавуны	70	80	70	100—110
Кабачкі (1 шт.)	30—50	40—50	30—40	40—60
Вінаград	600—700	500—700	250—700	500—700
Грэцкія арэхі	500	500	500	600
Часнок (1 шт.)	40	40—50	40	50
Лімоны	600	560—600	600	600
Апельсіны	450	480—520	520	520
Бананы	380	360—380	390—420	380
Грэчка	—	600	500	390—420
Макар. вырабы	180—220	220—280	220—240	200—220
Рыс	430	600	400	310
Проса	—	260	—	240
Цукар	220	260	240	210
Мёд	1.500.000	2.400.000	1.500.000	1.700.000

ВАЛЮТА НА "ЧОРНЫМ" РЫНКУ

(у тысячах рублёў)

	купля	продаж	купля	продаж	купля	продаж	купля	продаж
1 долар ЗША	680	700	680	700	620	650	580	630
1 дойчмарка	340	350	340	350	310	325	270	310
1 рубель Расіі	24	26	24	26	23	25	22	25

17 КАСТРЫЧНІКА. МІНСК. МАРШ СВАБОДЫ

ПОБОИЩЕ НА СВИСЛОЧИ

Время собирать камни... На пятачке, где пересекается улица Пулихова с трамвайными путями у входа в парк Горького, их лежит сейчас очень много. Сотни камней после побоища на Свислочи. Я была свидетелем битвы камнями, которая, думаю, к моменту выхода газеты в свет, уже будет показана многими телевизионными каналами.

Если сказать, что это было страшно, значит, ничего не сказать. Камень, ещё летящий камень, кусок тротуарной плитки, окровавленное лицо, синий след на лбу от милицейской дубинки, снова камень... Камнепад в сторону "рыцарей" в металлических доспехах, а потом наоборот — на "молодофронтовцев". И сложно разобраться, кто свой, кто чужой. Кровь, мат... Стоящие недалеко от побоища женщины плачут, протягивают ребятам с окровавленными лицами платки. Кто ранен, убегает во дворы, зная, что за ним будет погоня... Вступают в силу мужские законы войны, одинаковые для всех, как для "ментов", так и для молодых радикалов с бело-красно-белыми повязками. Ударили — отвечу тем же и буду до изнеможения бить противника. С этого момента он — смертельный враг и не советую вам оказаться где-то рядом. Ударят, не разбирая...

Около двадцати минут летели камни. Отряд милиции периодически менял дислокацию, то обороняясь, то наступая. Они то садились, прикрываясь щитами, то шли в наступление, размахивая дубинками. Видимо, когда милицейское начальство поняло, что это может продолжаться еще очень долго, решили воспользоваться более "современными" методами борьбы — пустили газ. Чтобы не оказаться легкой добычей в руках рассвирепевших милиционеров, "молодые бойцы" бросились наутек. Побоище закончилось. Началась расправа. Кто-то скрывался во дворах. Кого-то выгоняли прямо к реке, ребята были вынуждены прыгать в воду. Переплывали на другую сторону, но там их уже ждали...

Я была свидетелем следующей сцены. Встав в шеренгу на всю ширину тротуара улицы Пулихова, омоновцы занялись "зачисткой территории". Орали на женщин, стоявших у магазина: "Всем в магазин!" Когда я показала журналистское удостоверение, один омоновец крикнул: "Плевать на прессу, марш вперед!" Разгоряченные лица, доносящийся запах алкоголя, налитые кровью глаза. Было понятно, что здесь миндальничать не будут. Около двадцати омоновцев бросились к дверям магазина и из толпы людей выхватили молодого парнишку и начали изо всех сил бить его дубинками. У парня оголилась спина, и явно стали видны следы ударов и кровоподтеки. После этого его тут же поволокли к милицейской машине. Затем ряды омоновцев направились в конец улицы Пулихова и в близлежащие дворы. "Зачистка территории" продолжалась. Многим участникам битвы эту ночь пришлось провести не дома. По нашим сведениям, уже к вечеру в воскресенье было задержано около семидесяти человек.

Нервы не выдерживали у обеих сторон. На мосту одному здоровому детине в форме стало плохо. Он рухнул на землю, забился в конвульсии. Подбежавшие "коллеги" начали оказывать первую медицинскую помощь...

Анна СОУСЬ.
"НВ".

Работа для судоў

Паводле звестак праваабарончага цэнтра "Вясна-96", 18 кастрычніка ў судах Савецкага і Партызанскага раёнаў Мінска разглядаліся справы 63 удзельнікаў Маршу Свабоды, які прайшоў у Мінску 17 кастрычніка. Разгляд некалькіх спраў перанесены на больш позні тэрміны.

Большасць дэманстрантаў аштрафаваныя — памеры штрафаў склалі ў сярэднім ад 20 да 40 мінімальных зарплат (памер мінімальнай зарплаты складае ў Беларусі 1 мільён 450 тысяч рублёў або менш за 2,5 долара ЗША па курсе "чорнага" рынку). 18 чалавек прыцягнуты да адміністрацыйнага арышту — ад 3 да 15 сутак. У іх ліку — арганізатары Маршу Свабоды экс-дэпутат Вярхоўнага Савета Беларусі 12-га склікання Барыс Гюнтэр, які атрымаў 15 сутак арышту, і старшыня Беларускай сялянскай партыі Яўген Лугін — 10 сутак. Абодва яны асуджаныя судом Савецкага раёна Мінска. Усе асуджаныя прыцягнуты да адказнасці па артыкуле 167-1 КоАП РБ за парушэнне правілаў арганізацыі і правядзення масавых мерапрыемстваў.

Назіральнікі праваабарончага цэнтра "Вясна-96" адзначаюць выпадкі неаб'ектыўнасці пры разглядзе шэрагу адміністрацыйных спраў, калі суд фактычна заслухоўваў і прымаў пад увагу толькі паказанні супрацоўнікаў міліцыі. У сувязі з гэтым, адзначаюць праваабаронцы, да адказнасці маглі быць прыцягнутыя і грамадзяне, якія зусім выпадкова апынуліся каля месца правядзення акцыі апазіцыі.



Дзеянні асуджаны

Міжнародная праваабарончая арганізацыя "Міжнародная амністыя" выказвае занепакоенасць у сувязі з арыштам удзельнікаў Маршу Свабоды, які прайшоў у Мінску 17 кастрычніка г.г.

"Кожны з затрыманых за мірны ўдзел у маршы пратэсту супраць палітыкі прэзідэнта Лукашэнкі павінен быць неадкладна вызвалены", — гаворыцца ў заяве гэтай праваабарончай арганізацыі. "Міжнародная амністыя" не ўхваляе гвалтоўных метадаў барацьбы, аднак лічыць усіх тых, каго арыштавалі за законнае карыстанне правам на свабоду сходаў і мірных шэсцяў, вязнямі сумлення. "Міжнародная амністыя" патрабуе ад беларускіх улад, каб "усе супрацоўнікі органаў, вінаватыя ў збіцці дэманстрантаў, паўсталі перад судом".

Як паведаміլі БелаПАН у прэс-цэнтры грамадзянскай ініцыятывы Хартыя'97, дзеянні беларускіх улад у дачыненні да ўдзельнікаў Маршу Свабоды асудзіла і яшчэ адна буйная праваабарончая арганізацыя — "Міжнародная ліга правоў чалавека". "Тое, што беларускія ўлады адвялі для апазіцыйных мерапрыемстваў плошчу Бангалор, дастаткова аддаленую ад цэнтра, з'яўляецца фактам грубага парушэння права на свабоду сходаў, — гаворыцца ў заяве "Міжнароднай лігі правоў чалавека". — Калі падобным чынам паступаюць улады Нью-Йорка або іншага буйнога горада, прымушаюць удзельнікаў шэсця трымацца на адлегласці ад дзяржаўных устаноў, якія мітынгуючыя выбралі ў якасці аб'екту пікетавання, яны, тым самым, правакуюць гвалт і бяруць на сябе ўсю адказнасць за тое, што адбываецца".

Меркаванне БНФ

Упершыню за апошнія гады, адзначаецца ў заяве БНФ, на вуліцы беларускай сталіцы выйшлі дзесяткі тысяч людзей, якія дамагаліся адстаўкі нелегітымнага рэжыму, свабоды і рэформ дзеля росквіту сваёй краіны, спынення палітычных рэпрэсій. Галоўным патрабаваннем удзельнікаў Маршу Свабоды было спыненне здачы незалежнасці Беларусі.

Аднак, нягледзячы на тое, што адной з мэт Маршу Свабоды была падтрымка перамоўнага працэсу, улады, насуперак Канстытуцыі, забаранілі шэсце і прадэманстравалі, такім чынам, сваё сапраўднае стаўленне да перамоўнага працэсу. "Кардоны АМАПа і спецназа справакавалі сутыкненні, якіх не было б, калі б гарадскія ўлады з самага пачатку выконвалі канстытуцыйныя правы грамадзян на мірныя шэсці і дэманстрацыі", — гаворыцца ў заяве кіраўніцтва БНФ.

Заява ўрада ЗША

"Жорсткае падаўленне беларускімі ўладамі арганізаванага апазіцыяй і прайшоўшага ў Мінску 17 кастрычніка Маршу Свабоды ўяўляе сабою чарговае парушэнне Беларуссю сваіх абавязацельстваў як члена АБСЕ і яшчэ раз падкрэслівае наяўнасць у краіне канстытуцыйнага і палітычнага крызісу". З такой заявай выступіў 18 кастрычніка намеснік прэс-сакратара Дзяржаўнага дэпартамента ЗША Джэймс Фоўлі. Тэкст заявы распаўсюджаны інфармацыйнай службай пасольства ЗША ў Беларусі.

Джэймс Фоўлі канстатуе, што прайшоўшая 17 кастрычніка 1999 года акцыя была самай буйной маніфестацыяй у Мінску за апошнія гады, а таксама тое, што падчас правядзення Маршу Свабоды дзесяткі мірных дэманстрантаў былі збітыя і затрыманыя супрацоўнікамі міліцыі. Урад ЗША патрабуе ад Беларусі выканання ёю сваіх міжнародных абавязацельстваў і правядзення расследавання дзеянняў праваахоўных органаў 17 кастрычніка, а таксама неадкладнага вызвалення затрыманых па палітычных матывах, уключаючы аднаго з лідэраў апазіцыі — Мікалая Статкевіча. "ЗША застаюцца заклапочанымі нядаўнімі знікненнямі апазіцыйных палітыкаў і няспынным удушэннем незалежных сродкаў масавай інфармацыі", — заявіў Д.Фоўлі.

(БелаПАН).

● ТАКОВА ЖИЗНЬ

Улита едет, к сентябрю 2000 будет

Будет к 1 сентябрю 2000 года. Именно эта скорректированная дата ввода в действие рынка у двух вокзалов в г. Барановичи после реконструкции. Хотя первоначально намеревались ввести его в действие к 1 декабря этого года.

— Нереально, — уверяет директор рынка Иван Игнатьевич Лапковский и приводит свои доводы.

Дескать, хотя и ушли со стационарного рынка в апреле, но работы начались гораздо позже. И виной тому запоздалое финансирование, раскачка стройтреста. То пока землю выкупили, пока демонтировали фундамент... (Речь идет о небольшом участке земли со стороны улицы Тельмана, на котором располагался возведенный другой организацией фундамент, который предполагалось использовать для строительства рыночного административного здания, да выяснилось, что он негож). А времечко-то бежало. Почти как в той басне про Муравья и Стрекозу: "Лето красное пропела..."

— Что мы можем! Сами понимаете, все упирается в финансы. Деньги есть — работа идет, денег нет — стоит. И все же до зимы хотим вылезти из земли (имеется ввиду проложить коммуникации) и построить административное здание, а с весны начать возведение стационарной лаборатории, весовой, примерочной, камеры хранения и прочих подсобных помещений, — Лапковский как директор, конечно же, в курсе, что будет представлять собой обновленный рынок. — Мы же сами выступили инициаторами реконструкции, потому что дальше так работать было нельзя.

Святая правда, сидеть в грязи дальше было невозможно и решение приняли правильное. Согласно проекту реконструкция обойдется в 80 миллиардов рублей. Деньги автопарк как хозяин рынка изыскивает сам. Никто не освобождал его на это время от уплаты налогов, которые исправно нужно вносить в казну. Но дело-то не только в отсутствии денег, хотя это главная причина медлительности, наличествует еще и наша безалаберность, да и вообще — куда спешить? Вот будем потиху зарабатывать и потиху вкладывать. Месячная выручка от работы рынка составляет примерно 2,5 миллиарда рублей. 600 торговыми местами располагает "пятачок", ютящийся ныне под мостом и вылезающий едва ли не на проезжую часть улицы Фроленкова.

— Нормы не нарушаем, — упреждает мой вопрос директор рынка, — а мест действительно мало, всех желающих не обеспечить, но стараемся, ведь это чьи-то рабочие места и забывать об этом не надо.

Об этом не забывают. Правда, на эту тему среди предпринимателей ходит много разговоров достаточно злых и слово доллары почему-то не раз упоминается.

г. Барановичи. *Г. СТРОЦКАЯ.*

● СЛУЖБА 01

На кватэры ў вас газ

Нягледзячы на шэраг пераваг, якія ўласцівы звадкаванаму газу, ён мае і мноства такіх асаблівасцяў, з якімі, калі не лічыцца, то будзе складана пазбегнуць выбуху ці пажару. Аднак нярэдка ўладальнікі тых жа газавых плітаў адкрыта ігнаруюць патрабаванні правілаў пажарнай бяспекі пры іх эксплуатацыі.

Вось і жыхарка в. Волька Галіна Станіславаўна Саванчук спакойна пакінула газавую пліту з паставленай на яе распаленую гарэлку пасудзінай для гатавання ежы, а сама занялася гаспадаркай. Пліта ўстаноўлена на верандзе, сцены якой абабіты гафрыраваным кардонам. Буйное полымя гарэлкі, выскокваючы з-пад пасудзіны, патрапіла на кардонную сцяну. Здарыўся пажар, які пашкодзіў жылы дом.

Жонка жыхара Рудні Антона Мартынавіча Паўловіча вырашыла самастойна перапаставіць газавы балон у другую пабудову. Дапамагла гэта зрабіць сваячка. Шчыльнасць і надзейнасць злучэнняў падключанага балона жанчыны праверылі пры дапамозе запалак. У выніку выбуху абедзве жанчыны атрымалі апёкі.

Пацярпеў ад апёкаў з прычыны парушэння мераў засцярогі пры карыстанні газам і жыхар в. Ідчыкі Іосіф Ільіч Ганчар. У яго гаспадарцы быў пераведзены на газ звычайны кацёл-кормазапарнік пры дапамозе самаробнага прыстасавання. Пры паленні катла зляцеў шланг падачы газу. Імгненна ўспыхнула полымя, якое і прывяло да пажару — згарэла гаспадарчая пабудова, дзе быў установлены злашчасны кацёл.

Жыхар той жа вёскі Ідчыкі Яўген Аляксандравіч Голуб прыстасаваў для запраўкі аўтамашыны замест спецыяльнай аўтамабільнай газабалоннай устаноўкі звычайны бытавы газавы балон. Аднак, відаць, злучэнні былі не зусім шчыльныя, таму пры запуску рухавіка газ усплямяніўся. Узнікла пажар пашкодзіў аўтамашыну і хлеў, каля якога яна стаяла.

Гэта толькі некаторыя прыклады пажараў, звязаныя непасрэдна з парушэннямі правілаў карыстання газам. Не перастае здзіўляць неахайнасць, абыякавасць людзей, якія лічаць сябе майстрамі ўсіх спраў, самастойна, без умяшання спецыялістаў-газавікоў, праводзяць перастаноўку і падключэнне газавых балонаў ці пліт, правяраюць злучэнні на наяўнасць уцечкі газу пры дапамозе запалак, чаго рабіць недапушчальна. Небяспечна пакідаць уключаную газавую пліту распаленай без нагляду, бо пры кіпенні вадкасць патушыць агонь, а паступленне газу будзе працягвацца. Недапушчальна адкрываць краны пліты, не маючы ў руцэ запаленай запалкі ці запальніцы.

Д. КАВАЛЬЧУК, курсант-стажор інспекцыі дзяржпажнагляду АВПС
г. Івацэвічы і Івацэвіцкага раёна.

КТО ОТВЕТИТ ЗА СМЕРТЬ МОЕЙ ДОЧЕРИ ОКСАНЫ?

"Наши дети, — говорил когда-то классик, — самый большой источник радости и счастья в нашем доме. Но наши дети, — продолжил всё тот же классик, — могут стать причиной самого большого горя и трагедии в нашей семье".

То, что случилось в семье Галины Ивановны и Василия Владимировича Кулецких, жителей города Ивацевичи, увы, подтверждение этого. Горький рассказ убитой горем матери, потерявшей дочь, который предлагается вам, уважаемые читатели, наглядный пример того, что дети в нашем обществе — самая беззащитная и хрупкая его часть. А лозунг или призыв о том, что всё лучшее должно быть отдано детям, сегодня и вовсе пустой штамп, не гарантирующий им ничего, даже усиленного внимания. Потому сегодня так актуальны и значимы слова другого великого писателя: "Балуйте своих детей побольше, господа. Ведь вы ещё не знаете, что их ожидает".

ЗНАК БЕДЫ

Рассказ мамы

10 сентября в 00 ч 30 минут у моей дочери Оксаны появились резкие боли в области живота, под ложечкой в области желудка и отдавали сначала в правую сторону, а затем и в левую. Боль не утихала, и где-то в 5.30 я вызвала скорую помощь. Фельдшер осмотрела Оксану и — боль оказалась сильной — сделала обезболивающий укол, посоветовав утром обратиться к педиатру.

В 8.00 я отвезла дочь на приём к педиатру, где Оксану осмотрели, поставили диагноз — острый гастрит, назначили лечение, посоветовав обратиться к хирургу и взяв анализы.

После детской консультации мы обратились к хирургу. Прием проводил врач В. А. Павлик. Он осмотрел мою дочь и сказал, что подозрение на аппендицит он не наблюдает, патологии им выявлено не было. Он сказал, что, наверное, у неё не в порядке желудок или отравление.

Хирург В. А. Павлик отправил нас домой, никаких мер для выяснения причин боли не принял, согласившись с диагнозом педиатра.

В тот же день, 10 сентября, где-то около 15—16 часов у Оксаны поднялась температура, поднялась выше 38°.

Я сразу же вызвала скорую. Нас отвезли в приемный покой больницы, где дежурный врач С. Л. Макар осмотрел дочь и сказал, что её положат в хирургическое отделение для обследования.

Оставив Оксану в больнице (как я считала, в надежных руках) я уехала домой. Вечером, всё того же 10 сентября, я позвонила в хирургическое отделение, попросила к телефону врача С. Л. Макара. На вопрос, как самочувствие моей дочери, он ответил, что они сделали снимок и поставили диагноз: двухсторонняя пневмония. Из хирургии мою дочь перевели в детское отделение.

В 22.00, 10 сентября, мы с мужем поехали к Оксане в детское отделение. Температура не спадала, она продолжала жаловаться на боли в животе, хоть ей сделали обезболивающий укол.

На следующий день, 11 сентября (в этот день ей исполнилось 14 лет), где-то после 9.00, приехав к Оксане, я узнала, что её перевели в инфекционное отделение.

Медсестра детского отделения сообщила, что у неё открылась рвота и проявился жидкий стул, есть подозрение на отравление, но одновременно и пневмония. Дежурными же врачами пневмония не прослушивалась...

13 сентября Оксане было дополнительно назначено лечение — антибиотики и капельницы. Температура продолжала держаться высокой.

17 сентября было сделано "узи" почек, желчного пузыря, печени, затем повторный рентгеновский снимок лёгких, на котором двухсторонней пневмонии уже не было. В этот же день был взят анализ на инфекционное заболевание — иерсиниоз, результат которого требовалось долго ждать.



В этот же день, вечером, резко поднялась температура, и врач, заведующая инфекционным отделением Т. А. Рыжко отменила приём антибиотиков, назначила новый, для лечения иерсиниоза, после которого ей стало лучше, температура снизилась и была относительно низкой — 37,4 — в течении двух или трех дней. Затем снова резко поднялась и была высокой...

23 сентября с самого утра я позвонила Т. А. Рыжко и спросила о состоянии Оксаны. Она ответила, что диагноз иерсиниоз у моей дочери подтверждается. Я поблагодарила, но выразила сомнение в правильности поставленных диагнозов, сказала, что хотела бы взять рентгеновские снимки и везти Оксану в Брест или Минск. На что врач Т. А. Рыжко в резкой форме мне ответила следующее: "Так берите и везите своего ребенка куда хотите!"

Через некоторое время после разговора, в тот же день, Оксана по телефону мне сообщила, что её отправляют в областную больницу.

У меня нет медицинского образования, однако я, как мать, чувствовала состояние моей дочери и говорила Т. А. Рыжко о возможности аппендицита у Оксаны. Беседовала и с хирургом-урологом С. В. Котиком, который осмотрел Оксану 19 сентября. Однако и он сказал, что аппендицита у неё не наблюдается.

23 сентября я получила выписку из истории болезни, а 24 сентября своим транспортом отвезла Оксану в областную больницу. В направлении, подписанном Т. А. Рыжко, был поставлен диагноз — иерсиниоз, поставлен под вопросом, так как ещё не было окончательных результатов.

В Бресте дочь положили так же в инфекционное отделение. Большое количество антибиотиков, назначенных нашими врачами и принятых Оксаной, "смазали", по словам брестских врачей, всю картину болезни, поэтому для проведения обследования в областной больнице отменили все назначенные в Ивацевичах лекарства.

Приехав из Бреста, я позвонила Т. А. Рыжко. Поскольку её в отделении не было, передала медсестре, что никакой пневмонии у Оксаны не было (зав. рентгенкабинетом в Бресте описала снимок).

Вечером, всё того же 24 сентября, около 20.00 уже медсестра отделения позвонила мне и сообщила, что мои слова Т. А. Рыжко переданы и что она обижается на меня, что я ей неблагодарна. В конце разговора эта медсестра мне сказала: "Всё-таки вы ещё будете нас благодарить". За что же мне теперь вас благодарить, уважаемые врачи райбольницы? Скажите мне, пожалуйста.

27 сентября я уехала в Брест к Оксане. Уже в ночь с 26 на 27 сентября её срочно прооперировали, и она находилась в реанимации областной больницы. Был поставлен диагноз — перитонит. Это были последние часы, когда я видела свою Оксану живой. Мы надеялись на лучшее, но там же, в областной больнице, 28 сентября в 16 часов 30 минут Оксана умерла. Было слишком поздно.

Я не знаю, как мне отблагодарить медперсонал нашей районной больницы за причиненную мне душевную рану, которая не заживёт до конца моих дней.

Я понимаю, что никто не вернёт мне мою безвременно ушедшую из жизни кровиночку, мою Оксанку, смерть которой потрясла весь город и район. Но я не хочу, чтобы кто—либо оказался на моём месте и поэтому, обратившись во все инстанции, включая и суд, я хочу, чтобы разобрались во всем происшедшем и привлекли виновных к ответственности.

Г. КУЛЕЦКАЯ.
г. Ивацевичи.

***НАШ КОММЕНТАРИЙ.** Тринадцать дней и ночей в райбольнице Ивацевичского РТМО находилась 14-летняя Оксана и столько же времени ушло (его даже не хватило) на то, чтобы поставить девочке диагноз. Как оказалось, ошибочный. Можно много философствовать о том, что общественное мнение настраивают против медицины, что работники медицины делают всё возможное... Но послушайте, уважаемые доктора, пока что медицина для среднего человека — бездушное слово из восьми букв, за которыми, как оказывается, не обязательно может присутствовать профессиональная помощь, выздоровление, возвращение к жизни.*

Можно ещё говорить о злом роке, фатуме, неизбежности судьбы 14-летней девочки Оксаны. Да вот только нет, нет этих слов даже в медицинском словаре. А вот об медицинской этике, профессионализме, клятве Гиппократа сплошь и рядом говорится и подразумевается.

Можно ещё говорить о том, что медицина — нелюбимое дитя в семье государства, что ни зарплата, ни оборудование не соответствуют запросам времени и специалистов. Можно говорить, да вот случай не тот. Когда от аппендицита умирает юная девочка, то перед Богом хочется извиниться даже постороннему человеку. И формула ответственности проста и стара как и вопрос, с которым можно обратиться к кому угодно, в том числе к лечащему врачу: "А чтобы вы сделали, чтобы вы сами теперь говорили, если ваша дочь, ваша 14-летняя кровинушка умерла от аппендицита?" Дочь, над колыбелью которой, родители пропели столько песен, а теперь льют слёзы над могилой.

Сделали ли всё возможное ивацевичские врачи? Вопрос, на который ответ даст прокуратура и суд (Галина Ивановна, мама Оксаны, обратилась в эти инстанции). В конце концов, правда о смерти Оксаны нужна не мертвым, она нужна нам с вами, живым.

Трагедия семьи Кулецких потрясла город. Уверен, что смерть Оксаны — трагедия и боль и для тех врачей, кто лечил девочку. Мы не прерывали этот горький реквием комментарием специалистов РТМО. Но с готовностью готовы выслушать и их.

А. ГОРБАЧ.

СДЕЛАНО У НАС



Поиск партнеров продолжается

До недавнего времени основным кровельным материалом для наших строителей был рубероид, в то время как во всем мире строители работали с долговечным, высококачественным кровельным и изоляционным материалом под названием гидростеклоизол. Нашим кровельщикам он был просто недоступен из-за дороговизны. Собственного производства этого материала в республике не было.

В марте 1992 года на Бронной Горе по инициативе Министерства дорожного строительства республики и объединения "Облсельстрой" было начато строительство завода по производству гидростеклоизола. Подрядные работы выполнили строители ПМК-4. Технологическое оборудование нового предприятия поставило МПО "Союз". Технологию производства и наладку оборудования выполнило акционерное общество "ИРМАСТ". Сотрудники этого акционерного общества разработали гидроизоляционные высококачественные материалы, срок эксплуатации которых от 15 до 25 лет. Аналогов им на территории СНГ не было.

Первый квадратный метр нового гидроизоляционного материала был выпущен на Березовском заводе гидростеклоизола в ноябре 1994 года.

Пять лет, которые прошли с этой даты, для коллектива молодого, но уже известного не только в нашей республике, но и в России, на Украине, других странах ближнего и дальнего зарубежья, были непростыми. Дорабатывалась и совершенствовалась технология производства гидростеклоизола. Для выпуска этого кровельного материала необходимы стеклоткань, которую поставляет ПО "Стекловолокно" города Полоцка. Эта основа пропитывалась битумом (г. Мозырь и г. Новополоцк) в смеси с дробленой резиной (г. Могилев) и полипропиленом (Казахстан и Германия). Однако возникшие в силу политических размежеваний таможенные барьеры внесли свои непредвиденные коррективы в производство. Выпуск гидростеклоизола иногда останавливался из-за нехватки валюты на закупку необходимых компонентов и энергонасыщенному производству, где всё основано на безостановочном процессе, грозили нелегкие времена.

Но надо отдать должное энергии и разворотливости директора предприятия А. В. Снитко, главного технолога В. Н. Тарасенко, которые методом проб и ошибок продолжали поиск деловых партнеров. В итоге предприятие отказалось от германского и казахстанского полипропилена и перешло на модификатор бобруйского ООО "Регата ЛТД". По своим физическим качествам этот наполнитель не уступает зарубежному материалу. Но в итоге сэкономлена валюта, которая пошла на развитие производства. В партнерах-поставщиках значится объединение "Ковдорслюда" из Мурманска. Поиск деловых партнерских связей продолжается. Тем более, что гидростеклоизол никогда не залеживался на складе. Этот долговечный, высококачественный материал используется в кровельном и изоляционном производстве без применения приклеивающих мастик: для приклейки достаточно оплавления битумного вяжущего слоя горячим воздухом или газовой горелкой.

За 9 месяцев этого года его выпущено 1 миллион 239 тысяч квадратных метров. Это заслуга коллектива производственного цеха, руководит которым Николай Иванович Семеж. Варщиком битума начинал на заводе Николай Алексеевич Оскирко, однако его умение организовать работу четко, без авралов заметили, и назначили мастером. Ответственны за порученный участок работы машинист автопогрузчика Олег Адамович Мукосей, варщик битума Анатолий Захарович Кравченко, подсобный рабочий Вадим Васильевич Дранец, аппаратчики пропиточного агрегата Виктор Павлович Якушик, Михаил Петрович Омелюсик. Его отец, Петр Степанович, токарь — фрезеровщик, пришел на "Гидростеклоизол" одним из первых, и теперь трудовую династию Омелюсиков, включая маму, Нину Ивановну, кладовщика, хорошо знают на предприятии.

И еще один факт. В 1996 году ГП "Гидростеклоизол" стало открытым акционерным обществом.

В. РУСАКЕВИЧ.
г. Берёза.

● СУСТРЭЧА СА ЗНАКАМІТЫМ СУЧАСНІКАМ

Ніл Гілевіч: "ЗВЫЧАЙНА Я АДМАЎЛЯЮСЯ АД ІНТЭРВ'Ю: ЧЫТАЙЦЕ ВЕРШЫ!"

На філфаку БДПУ адбылася сустрэча з народным пісьменнікам Беларусі Нілам Сямёнавічам Гілевічам. Сустрэча жаданая і хвалюючая.

— Чалавек вырастае з культуры. Трэба развіваць у ім гэты духоўны пачатак (таму што гэтага можа і не адбыцца, што вельмі страшна). Людзі цяпер усё менш цягнуцца да кнігі, паэзіі — з гэтым я ўжо амаль звыкся. Але змірыцца ўсё роўна немагчыма. Гледзячы на вас, хочацца быць аптымістам, — пачаў Ніл Сямёнавіч свой паэтычны вечар.

Ён чытаў нам вершы як 40-гадовай даўнасці (два гады таму паэт адсвяткаваў 50-годдзе свайго выхаду "на людзі" праз друк), так і творы сённяшняга дня. За час сустрэчы мы паспелі апынуцца і ў роднай вёсачцы Гілевіча, і завочна пазнаёміцца з яго матуляй, і трапіць у рабінавую ноч, а потым — у белы-белы снежань. Ён вярнуўся ў час, калі толькі пачыналі працаваць Яўгенія Янішчыц і Алесь Разанаў, — дзякуючы вершу "Спявайце, юныя паэты". Ён прымусіў нас задумацца аб мове, гісторыі, аб Курапатах і нават аб характары беларуса. Ды што тут гаварыць, яго трэба проста чытаць. І слухаць.

А потым з усёй залы пасыпаліся пытанні. Таму размова, відаць, атрымалася не зусім спадарожаваная, трошкі спантаная. А, можа, у гэтым і свая непаўторнасць?

— Ці не здаецца Вам, што ў такі складаны як цяпер час з'яўленне вершаў у друку выклікае толькі саркастычную ўсмешку?

— Гэта індывідуальна (як я ўжо казаў, узровень культуры ў людзей розны). У людзей, якія наогул не бяруць у рукі кніжку, гэта, канечне, можа выклікаць і непрыманне, і нават сарказм. Людзей, якія не прымалі, не разумелі паэзію, заўсёды было многа: і дзве тысячы гадоў таму, і цяпер.

— Хто такі паэт у Вашым разуменні! Якое яго прызначэнне на гэтай зямлі?

— Ведаеце, прозай нельга адказваць на такое пытанне. У мяне ёсць дзесяткі вершаў на гэтую тэму. У прынцыпе, у любым маім зборніку вы можаце знайсці адказ на гэтае пытанне. Ну, а калі ў двух словах прозай: паэт прыходзіць і пішa для таго, каб на зямлі, сярод людзей было больш міру і спакою, любові і дабрыні. Але жыццё прымушае, і паэты мяняюць пяро лагоднае на гнеўнае.

— Што для Вас сучасная літаратурная Беларусь?

— Пытанне аб'ёмістае. Цікавая краіна, я вам скажу. І вельмі нявывучаная. Тут прысутнічаюць людзі, якія непасрэдна працуюць з літаратурай — выкладчыкі, вучоныя. Мне няёмка гаварыць пра крытыкаў, але ў мяне складваецца такое ўражанне, што наша літаратура апошняга часу амаль не асэнсоўваецца. Літаратурны працэс без асэнсавання крытыкай, тэорыяй, гісторыяй літаратуры — гэта самадзейнасць, літаратура, якая сябе не ўсведамляе. Такая літаратура не можа разлічваць на выхад у свет. Па сутнасці, мы перажываем зараз "учарашні дзень" заходняй літаратуры, "вынаходзім веласіпед". Але, між тым, літаратура "фіксуе" змены ў жыцці. Паяўляюцца цікавыя рэчы. Ну, вось прыклад (прабачце, што датычыцца вашага пакорнага слугі). Вясной 1985 года (тады абазначыўся курс на перабудову, свет кулём, усё кіпела, бурліла, уздымаліся самыя розныя праблемы) меў я неасцярожнасць апублікаваць раман у вершах "Родныя дзеці" — плён роздумаў усяго майго жыцця над усімі праблемамі, якімі жыве чалавек, у тым ліку, эканамічнымі, сацыяльнымі. Не паверыце! Прайшло год, два, тры, пяць... Ніводнай рэцэнзіі, водгуку. Твор пачалі вывучаць школьнікі — і анічога. (Раней на адну кніжку рабілася 5—6 водгукаў). Толькі карэспандэнтка "Звязды" зрабіла адну нататачку, штуршком да якой стала тое, што яна ў метро ўбачыла не зусім звычайную з'яву: дзяўчына чытала "Родныя дзеці".

— Песні Вы пісалі спецыяльна ці самі кампазітары бралі ўжо гатовыя вершы?

— Спецыяльна песень я амаль не пісаў. Магчыма, калі б я быў больш ініцыятыўным, песень было б больш. Цяжка сказаць, у чым тут справа. Можа, саромеўся, можа, лічыў, што няхай кампазітар сам убачыць верш, каб ён лёг на душу. Але іх усё роўна атрымалася нямала, як вы ведаеце. Маладыя любяць песні "Жаўраначка", "У бацькоўскім кутку", "Я хаджу, заказаны...", "Палыновая ростань", "Сонца ў азёрцы". Ніяк не разлічваў, што кампазітар Сацура напіша песню на мой верш "І ўсё-ткі дойдзем". Ну ніяк не думаў, што гэта можа быць песняй!

А з песняй "Вы шуміце, бярозы" была такая гісторыя. У пачатку 80-х гэтую песню спявалі ўсе. І вось адзін журналіст, які быў ва Усходняй Сібіры, аднойчы мне расказаў... "Заходжу, — кажа, — у шайман (карчма па-нашаму) перакусіць. Бачу — сядзяць брытыя хлопцы ў ватоўках, спяваюць тваю песню. Пытаюся ў іхняга карчмара, што гэта за людзі.

— А ў іх вялікае свята — амністыю далі.

Мне стала цікава, падышоў да іх, павітаўся.

— Вось, — кажу, — чую, што вы "А я лягу, прылягу" спяваеце. Ведаеце, я знаёмы з аўтарам гэтай песні — ён жыве ў нас, у Беларусі...

Тут адзін паглядзеў і гаворыць:

— Адыдзі, не перашкаджай. Нічога не разумееш — такую песню мог напісаць толькі наш чалавек!"

Здаецца, што гэтыя ўчарашнія зэкі ў вершах свайго ўбачылі? Гэта ж песня пра чалавека-волата, які трошкі стаміўся на сваёй жыццёвай дарозе. Песня пра тое, што трэба жыць, думаючы, пра што будуць шумець бярозы... Відаць, іменна гэта яны і адчулі — бярозы будуць некалі над кожным шумець...

— Як сярод "тутэйшых" застацца беларусам!

— Заставайцеся! Проста заставайцеся. Цяжка! Згодзен, цяжка. А можа, не так ужо і цяжка? Было б жаданне, агеньчык у душы, які трэба раздзьмухваць: ісці на тыя ветры, скразнякі, калі хочаце, якія будуць рабіць гэта. Бывае, загаварылі вы па-беларуску, а нехта не прыняў гэта — і ўсё, знікла ўсялякае жаданне. Не палохайцеся крытыкі, смеху!

А іншыя народы? Думаеце, яны не праходзілі праз гэта? Думаеце, адны мы такія? Да прыкладу, Славенія. Гэтая зямля тысячу гадоў была пад немцамі, пад Аўстрыяй... Над імі была чужая сіла, мова, культура. Нямецкая мова была, як у нас руская. Усе XIX ст. у іх ішло нацыянальнае адраджэнне, з'явіліся свае вялікія паэты. І ўсё роўна было вельмі цяжка.

Балгарыі прыйшлося перажыць падобнае. Балгарскі пісьменнік Іван Вазаў узняў гэтую праблему ў вершы "Родная мова", які я перакладаў, бо гэта ж пра нас! Колькі разоў чыталі, што беларуская мова непрыдатная для высокіх матэрый. Але і мы дажывём да іншых часоў, не будзе больш гэткага прыніжэння.

— Над чым Вы зараз працуеце!

— Вельмі многія паэты звярталіся ў сваёй творчасці да фальклору. Вазьміце яшчэ Купалу, апрацоўкі Міцкевіча, Сыракомлі. Рэдка які паэт не звяртаўся. Я таксама няямала залазіў "з галавой" у фальклор, працаваў з ім. Вы ведаеце, што ў нас унікальная ў гэтым сэнсе краіна; што вясковыя людзі зберaглі народную паэзію. А ёсць цэлы пласт фальклору, так званы "гарадскі" ці "жорсткі", "блатны" — вялізная галіна творчасці. Шкада, што гэты фальклор застаецца па-за ўвагай (крытыкі адназначна адмоўна ацэньваюць гэты пласт). У Расіі яго пачалі "выцягваць" у апошнія дзесяцігоддзі. У нас ён на рускай мове, а зацікавіў ён мяне сюжэтамі: звычайна яны даволі аднастайныя: няшчаснае каханне, смерць і г. д., але за ўсім гэтым — чалавечыя лёсы, трагедыі. Напісаў я ўжо каля 20 вершаў на гэтыя сюжэты, дакладней, песень. Пішу, спяваючы. Я ўсё жыццё займаўся фальклорам, таму мне лёгка падбіраць мелодыі. Паспрабаваў надрукаваць у "Полымі". Будзе кніга песень "Сюжэты", дзе палова твораў ад такога фальклору, а другая палова — ад песень паўднёвых славян. Не ўпэўнены, што песні адназначна будуць успрынятыя, але час пакажа.

— Якой якасцю характару павінна валодаць сапраўдная жанчына!

— Мне здавалася, што ў вершах я ўжо адказаў. Звычайна, калі мне прапануюць бліц-інтэрв'ю, я адмаўляюся: думаю, што ў вершах паэт расказаў пра ўсе свае думкі. Проста пачытайце вершы. А калі адным словам — чалавечая годнасць. Таму што жанчын без ласкі — няма, можна сустрэць жанчыну, якой не хапае годнасці. І гэта вельмі балюча.

— Як Вы ставіцеся да сучаснай моладзі! Ці ёсць вершы, прысвечаныя ёй!

— Так, ёсць творы. І публіцыстыка. Усе надзеі ў мяне на моладзь. Маё пакаленне ўжо адышло.... Моладзі пашанцавала — 10 гадоў таму была скінута цэнзура, мова стала свабоднай. І цяпер моладзь ужо іншай не зробіш. Многіх можна зламаць, але не ўсіх, далёка не ўсіх.

— Якой веры прытрымліваецеся!



— Вы маеце на ўвазе канфесію? А што вы думаеце, калі мяне ахрысціў поп у Лагойску, дык я адразу стаў набожным? Не, тады я набожным не стаў. Для мяне гэта вельмі цяжкае пытанне. Выхоўваўся я ў атэістычнай сям'і, бацька быў сапраўдным камсамольцам 20-х. Сярод твораў, на якіх мяне выхоўвалі, — "Біблія" К. Крапівы. Гэта суцэльны здзек над свяшчэннай кнігай.

На старасці гадоў я вымушаны быў многае перадумаць. Але дзякуй лёсу за тое, што ён даў мне зразумець, як дрэнна смяяцца над тым, што для іншых святое. Ніколі не смейцеся! Я пачаў паважаць усіх вернікаў розных канфесій. У царкву не хаджу: досыць хлусні, крывадушша звёдаў за жыццё. Бегчы, як вялікія дзяржаўнікі, у царкву, хапаць свечкі... Ды каб вы сталі сапраўднымі вернікамі, не рабілі б тое, што вы робіце. Я на іх падобным быць не хачу.

Ёсць яшчэ другая крайнасць. Многае ў літаратуры перакрэсліваецца. Гавораць: "Што яны напісалі? Яны славілі толькі савецкую ўладу!" Але ж не трэба забываць, што былі іншыя вершы, і прыходзілася пісаць такія, каб, як сабакам кінуў, каб не перашкаджалі пісаць, працаваць (бо інакш можна было апынуцца на Калыме ці ў Курапатах). Гэта зараз лёгка крытыкаваць, а паспрабавалі б крытыкі творча выжыць у той час.

— Калі Вы ўпершыню адчулі сябе знакамітым!

— Ці можа паэт, які думае пра лёс народа, думаць, знакаміты я ці не? Не павінен сур'ёзны паэт, пісьменнік думаць пра лаўры. Ён павінен пісаць. Я як паглядзеў зараз, колькі яшчэ задум, непачатых рэчаў у маіх нататніках — на 50 гадоў хопіць. Жыццё не давала ўсё зрабіць: Саюз пісьменнікаў, у Вярхоўны Савет запёрлі. Трэба было мову прабіваць.

XXX

На развітанне Ніл Гілевіч параіў кожнаму знайсці свайго паэта, бо не трэба спрачацца, хто з іх лепшы. Пажадаў, каб любоў да роднага слова прыдавала сілы і жыццёвай радасці.

Гутарку запісала ***В. САВУЦІНА****, студэнтка Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта (спецыяльна для "Газеты для вас").*

На стыку

На стыку двух тысячагоддзяў
Чыноўных душ слабее стык.
А дзе душа з душой не ў згодзе —
Шмат дзей нікчэмных і пустых.

Таму якісь мудрэц-мінчанін
Пытанне вынес на Савет:
"Якім павінен быць начальнік,
Пераваліўшы ў новы век?"

І дзень, і два ялі размовы
Мужы дзяржаўныя — і вось
Зрабілі важкія высновы,
Прайшоўшы тэмы ўсе наскрозь:

Начальнік мудрым быць павінен.
А гэта значыць — хітрым быць:
Лямантаваць пра сверб на спіне,
Часаць жа тое, што свярбіць.

Павінен быць дэмакратычным —
Каб "мужыкі" аб ім наўсцяж
Крычалі крыкам закадычным:
"У дошку свой! У сцельку наш!"

Павінен быць адукаваным:
Кампутар знаць і Інтэрнет,
Не блытаць Лівію зЛіванам,
Тым больш — санату і санет.

Яшчэ павінен быць культурным:
Не ўсякі сказ пускаць у ход,
І, калі трэба, гаркнуць: "Дурні!" —
Дык не часцей, як раз у год.

Ну, а галоўнае, канешне,
Што ён павінен знаць і ўмець —
Як крымінал, з усіх страшнейшы,
Біць беларушчыну насмерць:

Глушыць, таптаць, драпежыць мову,
Сляды гісторыі сціраць,
Сам дух "тутэйшы" выкарчоўваць
І з душ, і з сэрцаў выдзіраць.

Адно тады спакойна ўвойдзе
І важны чын, і добры клерк
У трэцяе тысячагоддзе,
У новы, дваццаць першы, век.

Я верыў ім

Я верыў ім, іх песням рады,
І быў упэўнены чамусь,
Што ні з-за якае прынады
Яны не сыдуць з барыкады,
Дзе сцяг трымае Беларусь.
Цяпер гляджу... О, крыж Ісуса!
Сышлі! І прагна смокчуць сусла.

Ю. М. Захаранку

Дзе ты, слаўны Юры Мікалаевіч?
Дзе ты, яснавокі наш сакол?
Колькі часу ўжо агнём палаючым
Апаляе думкі неспакой.

Жонка і дачка не спяць, гаротніцы,
Роспач кроіць сэрцы іх, як нож.
"Дзе ты, любы?
Дзе ты, татка родненькі?" —
Клічуць, плачучы, і ўдзень, і ўноч.

Кліча ў вёсцы маці
вечар кожненькі —
Голас чуе ўвесь палескі край:
"Дзе ты, мой сыночак,
мой апошненькі?
Азавіся! Слоўца хоць падай!.."

Беларусь уся, адвергшы домыслы
Чорных злыдняў, набрыдзі тупой,
Кліча: "Дзе ты, генерал мой
доблесны,
Абаронца і заступнік мой?"

Ты не знаў ганебнай блізарукасці
У паглядах на Радзімы лёс.
Сімвал волі —
сімвал беларускасці —
Па-сыноўску годна ў сэрцы нёс.

Дык ці ж дзіўна, што пігмеі ніцыя
У сляпой нянавісці-злабе
Вурдалакамі і крывапіўцамі
Акружалі ўсё цясней цябе.

Непахісны, сонечны, няўрымслівы,
Ніцых забаяца ты не мог.
І дарэмна радуюцца выпаўзні —
Ёсць у беларускім небе Бог!

Хоць і сыпле жоўтай скрухай
верасень —
Сэрца жыць не можа без надзей.
Сэрца верыць: вернешся ты!
Вернешся!
Каб было каму любіць людзей.

1999, верасень.

ПУЛЬС

● ПРОФЕССИОНАЛЫ

ПО ГЛАЗАМ В ЕЕ ЖИЗНЬ НЕ ЗАГЛЯНЕШЬ



— Из Барановичей приехали? У вас же есть Симакова, — с удивлением встретили в одной из минских клиник молодую девушку, у которой отслоилась сетчатка глаза.

Было это лет 20 назад. Уже тогда имя офтальмолога Тамары Николаевны Симаковой гремело не только в городе, но и в республике. Сегодня она возглавляет глазное отделение городской больницы. Редакцией газеты была предпринята попытка заглянуть знаменитому доктору в глаза и в душу.

— Тамара Николаевна, а у самой-то у Вас, как со зрением?

— Стопроцентное.

— А зачем тогда очки на столе?

— Возрастная норма.

— Раз уличить не удалось, вернемся к истокам. В медицину Вы пошли случайно, по зову души или, может, выступаете продолжательницей династии?

— Это была моя детская мечта, которой сразу после окончания школы суждено было сбыться. Я закончила Хабаровский медицинский.

— Хабаровский!

— Да. Я оттуда родом. А здесь оказалась только потому, что муж военный и, объехав Дальний Восток, Курилы, с 1958 года мы осели в Барановичах. Офтальмологию я выбрала еще в институте, но здесь такого места не оказалось, работала и участковым врачом — ждала, пока освободится место. С тех пор, как оно появилось, я — глазной доктор. Лечим, оперируем, делаем все, что можем, на что хватает энтузиазма, потому что кроме энтузиазма практически ничего нет. Мечтали ставить искусственный хрусталик — не тут-то было!

(Окончание на 7-й стр.).

● МЕРКАВАННІ

Аборт: аперацыя ці забойства?

З'яўленне на свет маленькага чалавека — гэта цуд. Але чаму не ўсе жадаюць мець дзяцей? Аборт — складаная аперацыя, якая па сутнасці забівае яшчэ ненароджанае дзіця, пагражае здароўю жанчыны. Што думаюць жыхары Бярозы пра аборт? Хто нясе адказнасць за смерць дзіцяці, якое не нарадзілася па волі яго маці і дактароў?



ВІКТАР: Да абортаў стаўлюся адмоўна. Адказнасць за тое, што жанчына ідзе на аборт у большай ступені павінен несці мужчына. Але, калі ў сям'і ўжо ёсць дзеці, то гэтае пытанне вырашаюць муж з жонкай разам. А аборт, безумоўна, гэта забойства.




ТАЦЦЯНА: Лічу, што адказнасць нясуць аднолькавую і мужчына, і жанчына. Матэрыяльнае становішча вымушае рабіць гэты крок. Нарадзіць дзіця без магчымасці даць яму ўсё патрэбнае?.. Гэта значыць, загадзя паставіць яго ў цяжкае становішча. Але мае адносіны да абортаў — адмоўныя.



ВАЛЯНЦІНА ІЛЬІНІЧНА: Так, я лічу, што гэта забойства. Але як гэтага пазбегнуць у наш час? Мужчыны адпраўляюць жанчын на аборты самі і таму больш вінаватыя ў гэтым. Але забараніць аборты цяжка, бо не ўсе здольны выгадаваць дзіця.



АНТОН АНТОНАВІЧ: Калі б не грашовыя цяжкасці, то ў сем'ях было б больш дзяцей. Не адзін-два, а троечацвёра. Адказнасць? Усё ж больш адказнасці павінна быць у мужчыны.



Як бачна з нашага апытання, людзі разумеюць, што аборт — гэта дзетазабойства. Таму мы жадаем, каб такія жахлівыя пытанні ў нашых сем'ях наогул не ўзнікалі. І прыводзім некалькі лічбаў і фактаў. На 18-ы дзень у зародка фарміруецца нервовая, крывятворная сістэма, органы стрававання, узнікае нейкае падабенства сэрца. У 3 месяцы з'яўляюцца зачаткі палавых органаў, пачынае касцянець скелет. Чалавек можа пашавяліць ручкамі і ножкамі. На 4-м месяцы ён ужо зусім сфарміраваны чалавек.

У 5 месяцаў дзіця здольна чуць не толькі сэрцабіццё маці, але і гукі з нашага свету, аб якім ён яшчэ нічога не ведае.

Нарэшце, яшчэ ў лоне маці чалавек атрымлівае бессмяротную душу.

Апытанне вялі А. ГОРБАЧ, Н. КАПЫЦІЧ, А. ГАНЧУК (фота).

● МЕДИЦИНА И МОРАЛЬ



На тему искусственного прерывания беременности, а если говорить проще, абортов, у нас как-то не очень принято говорить вслух, громко, прилюдно. Но проблема от этого не становится менее важной. Половое влечение, один из основных инстинктов человека, не всегда — как ни банально всё это звучит — приводит ко взаимности, любви, ответственности, семье. А потому в гинекологические отделения обращаются и обращаются женщины. Помочь рассмотреть эту проблему, понять её любезно согласилась главный акушер-гинеколог Березовского района Е. ВИКТОРОВИЧ.

Врач-гинеколог Е. Викторович: "РОДИТЕЛИ МОГУТ ПРЕДУГАДАТЬ ВОПРОСЫ"

— Елена Петровна, теме нашего разговора вроде уделяется внимание медицины, государством. А ситуация кардинально не меняется. Что ещё "забыли" сказать врачи, педагоги, родители детям, молодым людям?

— Медицина в целом и наш кабинет в частности, на мой взгляд, сделали и делают многое, чтобы просвятить, объяснить, предупредить. Вряд ли кто-нибудь упрекнёт нас. Более того, медицина взяла на свои плечи и просветительскую деятельность. Сегодня гинекологические обследования, лекции мы проводим в тех же школах, ПТУ. Кто не дорабатывает? Полагаю, что родители. От молодых людей 12—17 лет во время бесед доводится выслушивать вопросы, ответы на которые могли бы дать и родители. Мировоззрение детей растёт ежедневно. То, что ещё вчера не интересовало дитя, может его мучить уже завтра. Родители могут предугадать вопросы, которые ставит перед взрослеющим юношей или девушкой их организм. Надо просто заглянуть в глаза сыну или дочери, объяснить, рассказать о поллюциях, менструальном цикле. Ведь не только то, как обуть и одеть дитя должно волновать маму с папой!

— Кстати, о вопросах. Как Вы охарактеризуете нынешнюю молодежь, задающую Вам эти вопросы?

— Молодежь на тех лекциях сегодня держится уверенно, она довольно смела, всякие комплексы, видно, мучают только их родителей. Доводится выслушивать вопросы и о том, как правильно пользоваться презервативом, и о многом другом, что лишь подтверждает: большую часть молодёжи эта сторона жизни волнует, и что, в тот же момент, теоретическими знаниями юноши и девушки владеют немалыми.

— И что Вы видите на практике! Уменьшается или увеличивается количество абортов!

— Скажу с удовольствием, что количество абортов за текущий год у нас снизилось. И снизилось значительно. Считаю, что тут большую роль сыграла просветительская работа, которую проводит наш коллектив и наш кабинет планирования семьи под руководством Ю. В. Лашкевича.

— А каков социальный круг людей, обращающихся к Вам!

— Самый разный. Ведь то, что в народе называют "залёт" — увы! — случается с разными людьми. Может быть, те, кто имеет большие деньги, тратится на контрацептивы, чувствует себя в безопасности.

— Какие способы контрацепции наиболее часто применяются?

— Около 50% женщин применяют ВМС — внутриматочную спираль — недорого и в основном без неприятных последствий. Кроме них есть немало иных барьерных методов — таблетки, презервативы, пасты, свечи. Важно помнить и знать свои физиологические дни.

— Обращаются ли очень юные!

— Все обращения на искусственное прерывание беременности молодых девчат до 18 лет без заявления родителей мы не принимаем. А рожать? Рожают и очень молодые, рожала у нас и 14-летняя девочка. Ранняя половая зрелость проявляется не только в нашем городе и районе. Сами понимаете, что сегодня молодежь вопросами секса начинает интересоваться довольно рано.

— Может ли аборт привести к смертельному исходу!

— Нет. По крайней мере у нас в районе, да и в области, летальный исход не фиксировался.

— А последствия!

— Последствия могут быть самые неприятные: отдалённые — бесплодие, воспаление гениталий, эндометриоз (около 30% женщин страдают от этого заболевания). А также так называемые ранние последствия: остатки плодного яйца, кровотечения.

— А приходят ли на аборт одни и те же лица! Бывают ли, простите меня, "рекордсменки"!

— Те, кто попадает в подобной ситуации к нам, проходят беседы и консультации. Один кабинет планирования семьи Ю. В. Лашкевича что значит! Думаю, что после этого нашим женщинам стыдно будет нам второй раз на глаза показаться.

Но есть, есть определенный круг женщин, ведущих беспорядочную не только половую, но и семейную жизнь, склонные к алкоголизму. Вы понимаете, какой круг женщин я имею ввиду. К сожалению, подобные женщины в своей ежедневной жизни норм морали не придерживаются...

— Представим обратную ситуацию. Женщина хочет и не может забеременеть. Что влияет!

— Зависит от условий жизни, образа жизни. Курение и алкоголь — враг здоровью и материнства. Особый разговор и о тех стрессовых ситуациях, в которых время от времени оказывается любой из нас. Нормальная беременность должна протекать без стрессов. Морально женщина должна быть спокойна и уверенна. Это спокойствие ей может подарить любимый мужчина. Одна из наших пациенток нам рассказала о том, что, забеременев, шесть месяцев она переживала о том, как всё же выйти замуж за парня, отца будущего ребенка. Вышла замуж — новая головная боль: вернётся ли в семью муж, что отправился служить. Одним словом, стресс, вредные привычки — вот что вредит и нормальным родам, и зачатию.

— И последний вопрос. А вы сами, Елена Петровна, как считаете, убивается ли абортом жизнь?

— Да. Это варварство, грех, это убийство. И если нормальное общество функционирует на должном уровне, то подобные вопросы там сведены к нулю.

Беседовали Н. КОПЫТИЧ, А. ГОРБАЧ.

● ПРОФЕССИОНАЛЫ

ПО ГЛАЗАМ В ЕЕ ЖИЗНЬ НЕ ЗАГЛЯНЕШЬ

(Окончание. Начало на 6-й стр.)

Нет инструментария и стоит он столько, что больница просто не в состоянии купить.

— Оперировать глаз... Такой сложный орган. Страшно.

— Никакого страха. Не испытывала его даже во время первых операций, а сейчас и подавно. Все знаешь, каждый ход, каждый шажок. К операции надо приступать с настроением и уверенностью, что все будет хорошо.

— А вера в Бога врачу нужна! Лично Вы верите!

— Врачу в первую очередь нужны знания, а вера — личное дело. Я же воспитана без Бога. Время тогда было такое, а сейчас не пристало пересматривать убеждения. А вот телепатия у меня есть. Бывает, пишу историю болезни и думаю о больном. И тут открывается дверь и он, либо его родственники заходят.

— Глядя на Вас, создается впечатление, что к вершинам Вы никогда не стремились?

— Какие вершины! Я даже о науке не помышляла. И не жалею об этом. Практический врач всегда больше знает, больше умеет. Думаю, я как раз на том месте, быть на котором мне предписано самой жизнью. Я люблю свою работу, она для меня жизнь. Я себя вне ее не представляю, не представляю себя на покое. Сейчас ведь занята. И если бы рабочий день длился 24 часа в сутки, то все 24 часа работала бы. Сколько раз бывало, что трижды уходила домой и трижды возвращали: "Вы уходите? А мы к вам!" Или вот буквально вчера в 8 утра человек на консультацию из Ляховичей. А в это время столько работы в отделении! И все же приняла. И так каждый день.

— Все мы в курсе, сколько зарабатывает врач. Но Вы, с Вашим опытом и авторитетом, богатая женщина!

— Не могу себя таковой назвать. Медицина никогда не была высокооплачиваемой отраслью, а уж сейчас... На днях выступал министр труда и привел такой пример. Дескать, не так уж плохо мы живем. Раньше получали по 120 рэ и могли на них купить 10 бутылок водки. Сейчас средняя зарплата по республике 22 миллиона. На них можно купить 100 бутылок водки. Но о каких 22 миллионах он вел речь? Наши врачи столько не зарабатывают, а где-то 16. Медсестры и вовсе 5—6.

Материальное благополучие моей семьи вовсе не мной обеспечивается. Мужем, сыном.

— А, самое время спросить Вас о семье.

— У меня два сына. Старший, Андрей, живет в Минске, растит 5-летнюю дочь Катю. Младший, Шура, живет с нами, работает на комбинате пищевых продуктов. Муж, Валентин Андреевич, майор в отставке, ныне начальник штаба гражданской обороны все того же комбината. С мужчинами мне повезло, они молодцы. Всегда находила и нахожу поддержку и понимание. А о помощи и говорить не стоит! Они все умеют и ДЕЛАЮТ!

— Позвольте крамольный вопрос: Вы не устаете от людей, особенно от больных людей!

— Представьте себе, нет. Они моя жизнь, моя работа. Не припомню, чтоб кричала или даже голос повышала. Терпеливо объясню раз, они приходят снова. Снова объясняю, а они с тем же вопросом идут снова. Объясняю и третий раз. Терпения хватает, я человек спокойный, неконфликтный.

— Тамара Николаевна, вокруг Вас больше врагов или друзей, завистников или доброжелателей?

— Конечно же, друзей. Я в этом уверена!

Самое время для отступления.

Дважды Симакову представляли к званию Героя Социалистического Труда, но в итоге звания доставались другим, а она как лечила, так и лечит. Возвращала и продолжает возвращать зрение — этот бесценный дар, данный нам самой матушкой-природой.

Автор этих строк Галина СТРОЦКАЯ ранее ходила к доктору Симаковой вовсе не за интервью.

г. Барановичи.

● ПРАВІНЦЫЯЛЬНЫЯ ГІСТОРЫІ

Спыніце аўтобус



Маршрутны, набраўшы сярэднюю хуткасць, едзе з аддаленых вёсак у райцэнтр. Салон набіты людзьмі, нібы бочка селядцамі, яны, пасажыры, панура пераглядаюцца, перагаворваюцца са знаёмымі. Сем гадзін раніцы, твары многіх захоўваюць здзіўлены выраз нядаўняй дрымоты.

— Дайце, дайце месца, — раптам загаманілі ў канцы салона. — Дзяўчыне кепска стала.

— Каму? Чыёй? — заварушыліся ў аўтобусе.

— Канешне, тут жа дыхнуць няма чым, душагубка. Чаго ён сядзіць? Устаньце, дзед, устаньце. Бачыш, як збялела.

Дзед, збянтэжаны, устае, уціскаецца ў натоўп. Дзяўчыну ўсаджваюць. Хлопец, які едзе з самлелай, абхапіў яе за галаву, туліць да сябе.

— А чыя гэта? Хто? А-а, мусіць зацяжарыла дзяўчына...

— Ой, хто яе не ведае. Гэта, можа, яе дзесяты хахаль...

— Ціха! Вяселле ж было на мінулым тыдні.

— Ой, яшчэ нейкае вяселле ёй рабілі. Смех!

— Закрыйце люк, таварыш ваенны. У мяне плечы адкрытыя, я і так не выкачалася яшчэ ад нядаўняй прастуды.

— Так ведь ей нужен свежий кислород, женщина!

Трохі ажыўшы салон праз цэлы лес локцяў і рук заглядваў на самлелую. Маладая кабета расчапіла сумачку, дастае нейкія таблеткі і адну з іх, зялёную, засоўвае ў рот дзяўчыне; кабета азіраецца, нібы хоча, каб усе засведчылі яе велікадушнасць.

— І пхаецца ж ледзьве-ледзьве гэты аўтобус...

— Можа, ей лепш? Мусіць жа яна расплюшчвала вочы?

— Яна адкрывала вочы, адкрывала, — пішчыць нейкае дзіця, што са здзіўленнем і страхам глядзіць на самлелую.

— Не, вочы заплюшчаныя. Дык яна цяжарная, я яе адразу вылічыла на прыпынку.

— Якую вы ёй далі таблетку? — нечакана пытае ў кабеты хлопец, працягваючы туліць да сябе самлелую.

— Я... смазга... мазга... спазмазга...

— Можа, спазган? — пытаецца нейкая высокая дзяўчына ў кабеты.

— Так, спазган, так, — выдыхае кабета, са страхам гледзячы на хлопца.

— Таварыш ваенны, зачыніце люк, бо і я самлею!

— От утреннего кислорода еще никто не сомлел, женщина.

— А мо ёй пара раджаць? — з няўпэўненасцю звяртаецца адна з жанчын да хлопца.

Усе з напружаннем глядзяць на хлопца, ён праз невялікую паўзу адмоўна круціць галавой. Жанчыны ўхмыляюцца.

— Ой, адкуль ён ведае. Ён адно месяц, можа, як з ёй знаёмы.

— Ну дык мо яны сустракаліся, ён ведае...

— Сціхні, Нюра, сціхні. Хто сёння каго пільнуе. Сёння гэтая моладзь нічога не пільнуе. Спяць, хто з кім хоча. Не тое, што мы з табой калісьці.

— Але хіба яе памацаеш бы курыцу. Калі б раджала, то б крычала...

— Прачнуліся, — бурчыць вадзіцель, стараючыся праз люстэрка бачыць што ўбачыць, але люстэрка фіксуе толькі локці, рукі, асколкі твараў, хусткі.

— Мусіць, раджаць будзе дзяўчына! — радасна паведамляе вадзіцелю дзяўчына, што вісіць на поручні.

— Што? — выцягваецца твар у вадзіцеля.

— Дык што? Можа спыніцца ці ехаць хутчэй?

— Якое можа быць "спыніцца"? Цераз дваццаць хвілін электрычка, а тут нейкае спыніцца!

— Ты гэта... патрасі яе трошкі, — раіць хлопцу пакрыўджаны дзядок. — Мусіць жа яна... храпе.

— Таварыш ваенны, закрыйце люк! Або аддайце мне свой кіцель. Будзьце мужчынам!

— Может вам дать еще за что подержаться?

Аўтобус тым часам імчыць па вёсцы, пасля "прычальвае" да прыпынку. Людскі натоўп, што яго чакаў, абступае дзверы і, як толькі яны зашыпелі, лезе ў салон.

— Куды! Не лезце! Назад! — закрычалі на іх. — Тут дзяўчыне блага, хай выйдзе і пасядзіць на паветры.

Хлопец сапраўды дапамагае ледзь жывой спадарожніцы выйсці, яна сядае на бардзюр, закрывае твар рукамі, людзі на прыпынку збянтэжана азіраюцца, пасля лезуць у аўтобус.

— Ты пасядзі, Людка, пасядзі! — крычыць самлелай з акна аўтобуса адна жанчына.

— Сапраўды, жывот у яе вялікі, — згаджаецца другая.

— Хіба ж гэта вялікі? — не згаджаецца трэцяя.

— Дакуль у яе білет быў? Хто ведае? — злосна пытае вадзіцель.

— Якая розніца, шафёрык, якая розніца. Яна пасядзіць, ёй палепшае. Яна даедзе, тут блізка. Ды ёй жа не ў першы раз па палутках шастаць...

Дзверы зачыняюцца. Аўтобус марудна кранаецца, пыхнуўшы ў бок парачкі дымам з выхлапной трубы...

— Вы зачыніце люк, таварыш ваенны, ці не?

А. МІХАЛЕНКА.

● ЭНТУЗИАСТЫ

КЛУБ ОДИНОКИХ И РАЗБИТЫХ СЕРДЕЦ



Почтальоны всякий раз, когда он забирает письма на почте, с удивлением спрашивают: "Молодой человек, кто вам столько пишет?" У него же в подвале накопилось их уже столько — целые ящики! И ни одно не утеряно, не выброшено, на каждое дан ответ. Всё это во имя одной цели — помочь молодым людям решить их проблемы, для чего, собственно, и был создан вышеупомянутый клуб. В планах на будущее: помощь детям из детдомов, больным, алкоголикам — в этом мире всегда полно тех, кто нуждается в помощи, а также открытие собственного офиса со всем необходимым. Пока же у него есть только шариковая ручка, бумага, конверты и непреходящее желание продолжать начатое дело — помогать людям.

Нашего героя, как он сам представился, зовут Александр...

— Довольно грустное название у Вашего клуба.

— Почему? Разбитые и одинокие сердца — часть нашей жизни и от этого никуда не денешься...

— А как Вы пришли к созданию такого не совсем обычного клуба!

— Было это 24 мая 1997 года. Сидели мы с моим приятелем Юрой в подвале, занимались резьбой по дереву и размышляли заодно о своих проблемах, проблемах друзей и подруг. Кто-то кого-то бросил, кому-то не с кем поделиться своим горем и т. д. То есть среди нас полно людей, молодых людей, нуждающихся в поддержке, совете. И тут возникла мысль — создать клуб, чтобы помочь этим людям, помочь пережить чёрную полоску в их жизни. Более того, мы интересовались психологией, у нас было много литературы, тестов для самооценки личности и т. д., а также и какой-то свой опыт. Мы решили попробовать — сняли абонентский ящик, купили конверты, бумагу. Давали объявления в газеты, писали вручную, клеили на досках объявлений.

— Много людей откликнулось!

— За первые два месяца получили около 150 писем. Стали отвечать, но этого оказалось мало. Люди хотели встретиться с нами, в основном это были девушки, поговорить. Пришлось даже съездить в такие города как Витебск, Орша, Гомель, Минск, Гродно, Барановичи. Всё это, конечно, сильно ударило по нашему бюджету.

— Денег Вы не берёте!

— Нет. Все поездки, конверты, бумага за свои деньги, из своей зарплаты. Приходится в чём-то себе отказывать, на чём-то экономить. Были бы рады, если бы нашлись спонсоры, помогли материально. Не для нас лично, а для дела. Взять ту же почтовую оплату, марки, конверты.

— И насколько сейчас велик Ваш клуб!

— Поначалу нас было четверо: я с другом и две девушки. Девушкам через некоторое время это, видимо, надоело и они ушли. Юра сейчас в армии. Поэтому пока приходится работать одному. Кое в чём помогают наши бывшие клиенты, со многими из них завязалась постоянная переписка. А вообще членами клуба у нас считаются все обратившиеся. На сегодняшний день их около двух тысяч.

— Как вы определяете результаты своей работы!

— Люди присылают нам благодарственные письма. Поверьте, их много. Благодаря нам уже сыграны две свадьбы, мы помогли людям найти друг друга. Кроме моральной поддержки, советов, мы ещё помогаем и в приобретении друзей, в каком-то роде выступаем в роли службы знакомств.

— Александр, насколько я понимаю, это действительно трудоёмкое занятие — отвечать на такое количество писем, куда-то ездить. К тому же абсолютно неприбыльное в материальном измерении. У Вас не возникало порой мысли бросить эту затею? Как долго вообще Вы собираетесь это продолжать!

— Бросать не собираюсь. Я по натуре такой человек, что если чем-то занялся серьёзно, то это надолго. Кроме того, мне самому нравится это занятие, приятно сознавать, что наш клуб реально помогает людям. Со временем собираюсь открыть что-то вроде центра, чтобы нуждающиеся люди могли не только написать нам письмо, но и приехать, получить поддержку, даже материальную. Постоянно ищем контакты с единомышленниками, профессионалами. Ещё одна сторона нашей деятельности — проведение конкурсов. Сейчас наш клуб объявил конкурс на самое интересное романтическое письмо. Конкурс проводится до 1 декабря, авторы лучших писем будут поощрены призами. Так что ждём ваших писем по адресу: **Брестская обл., 225210, г. Берёза, а/я 7, Александру.**

XXX

Действительно, хорошо, что есть люди, способные помочь одиноким и разбитым сердцам. Бесплатно.

Н. СИНКЕВИЧ.

г. Берёза.

НАША ГІСТОРЫЯ

СВАЕ І ЧУЖЫЯ

(Працяг. Пачатак у № 42).

5.

А тым часам усіх падстарынцаў, у тым ліку і Валянціну Макарэвіч, чакалі новыя выпрабаванні.

Расказвае Вера Сяргееўна Розіна (дзявоцкае прозвішча Гулевіч):

— На другі год вайны ўжо многа партызан знаходзілася ў лесе. Наведваліся яны і ў Падстарынь. Так, у пачатку мая 1942 года партызаны на чале з Васілём Іванавічам (так звалі ў лесе К. Д. Талочку, нашага мясцовага актывіста) разагналі ў Падстарыні самаахову. Пры гэтым быў забіты намеснік каменданта Івацэвічаў, а паліцаі разбегліся...

Тады ж, як успаміналі старажылы, партызаны мелі намер, забраўшы зброю, забіць і солтыса Казіка і спаліць хату. У тую ноч у перастрэлцы яго паранілі. Але падстарынцы, што сярод ночы сабраліся, угаварылі партызан не падпальваць солтысаву хату.

— Калі спаліце, немцы ўсю вёску вынішчаць, — казалі вяскоўцы. — Лепей не чапаць. Казік усё ж свой чалавек.

Партызаны не пайшлі супраць волі сваіх землякоў.

А на наступны дзень карнікі на машынах і матацыклах паявіліся ў вёсцы. Яны прагнулі помсты. Пазганялі ўсіх жыхароў да школы. Жанчын, дзяцей і пажылых вяскоўцаў зачынілі ў школе.

— Зранку я знаходзілася дома, з малым дзіцём сядзела, — успамінае Марыя Антонаўна Кірыенка, жыхарка Падстарыні. — Калі пачалі зганяць людзей у школу, дзіцё забралі суседзі і самі схаваліся. Я легла ў ложак, нібы хворая на тыф. Немцы баяліся гэтай хваробы. Але паліцаі вытурылі мяне і з ложка, і з хаты. Я вымушана была ісці разам з усімі пад канвоем. Маладзейшых мужчын у той дзень зранку пагналі ў лес на нарыхтоўку драўніны. Ці гэта супадзенне, ці наўмысна Казік зрабіў, каб ратаваць людзей. Кінулася ў вочы яшчэ і тое, што паблізу школы стаяла многа павозак. Іх прыгналі сюды з Любішчыц і Панкоў, каб забраць маёмасць спаленых падстарынцаў. Мы і самі адчулі, што, мусіць, наступае канец. Немцы не пашкадуюць нікога, паб'юць і спаляць усіх...

Расказ дапаўняе Валянціна Аляксандраўна Макарэвіч:

— У школе не пераказаць, што адбывалася. Крык, лямант, плач. Вяскоўцы былі ў адчаі, ведалі, што іх сагналі сюды на пагібель. Калі не страляюць, значыць будуць паліць. Спрабавалі вяскоўцы заглядваць у вокны, але немцы адразу настаўлялі аўтаматы, каб не лезлі. Я з Верай Гулевіч стаяла ля сцяны паблізу акна. Мы дамовіліся: як толькі школу падпаляць, трохі пачакаем і будзем лезлі ў акно. Хай лепш заб'юць, чым задыхацца ў дыме і гарэць. Але ішлі мінуты і ніякіх дзеянняў немцы не прадпрымалі. Падстарынцы накрычаліся, наплакаліся і супакоіліся. Дзеці, як самыя цікаўныя, па-ранейшаму заглядвалі ў вокны. Трывожнае чаканне працягвалася. Колькі мы чакалі, зараз сказаць цяжка. Думаю, што гадзіну, не меней, так гібелі, не верылі ўжо ў якое-небудзь цуда. І раптам дзверы адчыніліся, і немец скамандаваў: "Коммен!" Усе зразумелі, што трэба выходзіць і кінуліся да дзвярэй...

6.

Чаму ж карнікі не здзейснілі свой крывавы план, які заключаўся ў тым, каб знішчыць жыхароў, а потым спаліць і вёску?

Тыя з падстарынцаў, хто схаваўся і знаходзіўся паблізу школы, расказвалі потым наступнае.

Калі ўсіх жанчын, дзяцей і старых зачынілі ў будынку школы, немцы пачалі рыхтавацца да падпалу. Самы галоўны карнік у форме обер-лейтэнанта стаяў паблізу і аддаваў загады сваім падначаленым. У гэты момант да яго падышоў солтыс Казік з Іосіфам Яблонскім. Казік стаў перад нямецкім афіцэрам на калені і пачаў гаварыць (перакладваў солтысаву просьбу Яблонскі):

— Пане, афіцэр! Мірныя жыхары ні ў чым не вінаватыя, што бандыты ў лесе. Бачыце, я і сам пацярпеў. Я ад усіх падстарынцаў прашу — не рабіце зла, не знішчайце людзей. Калі будзеце паліць і страляць, то першага расстраляйце мяне. Я не магу, я не вытрымаю такі здзек...

Гэтая просьба солтыса, відаць, падзейнічала на афіцэра. Ён некалькі хвілін гергетаў са сваімі памочнікамі, а потым даў каманду спыніць карную акцыю.

Немцы паехалі, а падстарынцы, угнуўшы галовы, пабеглі па сваіх хатах, молячы Бога і дзякуючы Казіку і "Немцу", што выратавалі іх ад смерці. У той вечар вяскоўцы доўга не клаліся спаць: а раптам карнікі перадумалі і праз хвіліну-другую зноў паявяцца тут? Многія наогул не распраналіся і не думалі спаць, не верачы таму, што той жудасны страх мінуў, і ўсё закончылася мірам.

7.

Але ж паняцце мір было, можна сказаць, адносным. Ішла вайна. Ваявалі не толькі на фронце, але і ў тыле ворага. У Буленскім, Гута-Міхалінскім і Воўча-Норскім лясах ужо дзейнічалі значныя сілы партызан. Аб'ектамі іх нападу сталі чыгунка, масты, дарогі, варожыя гарнізоны. Так, 1 жніўня 1942 года аб'яднанымі сіламі партызаны знішчылі нямецкі гарнізон у Косаве. Там цэлы месяц існавала савецкая ўлада. Таму немцы, не маючы магчымасці справіцца з партызанскім рухам, які разрастаўся і шырыўся, сваю злосць зганялі на мірным насельніцтве — палілі вёскі разам з людзьмі, знішчалі цэлыя сем'і. Гэта была звычайная надзённая "работа" карнікаў. Таму невыпадкова, што жыхары ў акупацыі, як і ў той жа Падстарыні, жылі ў штодзённай напружанасці і страху.

Кожны дзень прыносіў новыя навіны, адбываліся самыя розныя падзеі. Кагосьці арыштоўвалі, хтосьці знікаў з дому, нічога не сказаўшы нават бацькам — ішоў у лес або ў паліцыю. Як правіла, кагосьці абшуквалі, штосьці забіралі. Але ж людзі неяк жылі, цярпелі, пакуль цэлае жытло, ёсць дах над галавой. Апрацоўвалі свае агароды, сеялі жыта, вырошчвалі гародніну. Трэба было карміць сям'ю. Партызаны таксама карміліся з вёскі. Хто па-добраму прасіў, а хто і сам забіраў каня, парасё ці хлеб. Усялякія былі і сярод лясных салдатаў. Сёння пра гэта ўжо гавораць услых, без боязі, што нехта западозрыць у прадузятасці ці падмане. Ішла вайна, і кожны стараўся выжыць па-свойму.

Былі ў Падстарыні і паліцаі, якія душылі сваіх жа землякоў. Пра некаторых нямецкіх прыхвасняў гаварылася ў нашай газеце летась, калі расказвалася пра маладога падстарынскага патрыёта Аляксея Гулевіча, якога катавалі, а потым расстралялі. Яго ж, па сутнасці, выдалі немцам свае вяскоўцы, паліцаі.

Таму невыпадкова ў камендатуры ў Івацэвічах ведалі пра ўсё, што адбываецца ў Падстарыні, хто пайшоў у партызаны, хто спачувае ім, хто іх корміць. Карнікі даволі часта прыязджалі ў Падстарынь, каб застрашыць непакорлівых, а таго-сяго прыстукнуць або спаліць, каб іншым непаважна было. Такі ж лёс, як Аляксея Гулевіча, напаткаў Р. Р. Васілевіча, В. А. Гулевіча, В. Р. Гулевіч, А. М. Макарэвіча, І. А. Мікалайчыка, сем'і яўрэяў Касоўскіх...

8.

Успамінае Марыя Антонаўна Кірыенка (па першаму мужу Касавец), жыхарка вёскі Падстарынь:

— Помню той вясновы дзень 1943 года. Лямант стаяў на ўсю вёску. Немцы і паліцаі рабілі аблаву, шарылі па сялянскіх хатах і падворках. Самых непакорных і падазроных выганялі на пляц, дзе зараз размяшчаецца будынак старой школы. Да нас таксама заскочылі на падворак, пабегалі тудысюды, пазаглядвалі і пайшлі далей па вуліцы...

— Чым жа ўсё скончылася? — пытаюся ў Марыі Антонаўны.

— Там, на пляцы, куды немцы і паліцаі прыгналі некалькі сем'яў, не стралялі, а дапытвалі, пагражалі і некаторых нават адпускалі. Аднак карнікі не маглі паехаць адсюль, не пакінуўшы свой паганы след. Яны ведалі, што Кірыл, не родны сын В. Я Касаўца, знаходзіцца, па іхніх дадзеных, у партызанах, таму адразу забралі ўсю сям'ю — бацьку, маці і дзяцей. Праўда, сына Лёню паспелі схаваць суседзі. А Міхаіл разам з сястрой папаў у лапы карнікаў...


9.

— Я ніколі не забуду той жудасны дзень, — гаворыць М. В. Касавец. — Як можна забыць, калі я згубіў родных, застаўся без хаты. Як сёння помню, гэта было 20 сакавіка 1943 года. Я з братам Лёнем знаходзіліся ў суседзяў. Яны і ўбачылі, што ў нашу хату пайшлі немцы. Лёню, як меншага, схавалі ў хляве, а мне сказалі: "Ідзі дахаты і пагляндзі, што там робяць немцы". Я і пайшоў. Спярша яны не пускалі мяне, а калі я сказаў, што я тут жыву, дазволілі зайсці. Пасля кароткай размовы нас усіх — бацьку, маці з маленькай Аленкай на руках, брата Івана і мяне — пагналі на пляц ля цяперашняй старой школы. Тут паралельна вуліцы стаяла хата, у якой дапытвалі бацькоў. Мы, дзеці, сядзелі на кухні і чулі, як паліцаі білі бацьку, распытваючы яго пра Кірылу. Пасля допыту бацьку, маці з Аленкай і Івана пагналі да нашай хаты, а мяне немцы забралі і пасадзілі ў кузаў крытай машыны, дзе мяне ахоўвалі двое немцаў з аўтаматамі...

Застаўшыся жывым, але ў руках фашыстаў, Міхаіл не ведаў, што з ім будзе далей, чаму немцы вязуць яго з сабой. Хлопец быў у недаўменні. Яго павезлі ў Любішчыцы, а на другі дзень — у напрамку Слоніма. Праз два дні машына спынілася ля нейкага будынка, куды і павялі Міхаіла. Там за агароджай бегалі дзеці — ад двух да пятнаццаці гадоў — беларусы, рускія, прывезеныя адусюль. Гэтая ўстанова нагадвала сабой дзіцячы дом.

Выхавальніцамі працавалі жанчыны. Загадваў усёй гаспадаркай паляк. Яго баяліся дзеці, бо ён караў непакорных папружкай. Што гэта была за ўстанова на самой справе? Міхаіл Касавец не ведае і да сённяшняга дня. Адно бачыў: немцы часта прыязджалі сюды, адбіралі з дзесятак хлопчыкаў і дзяўчынак і везлі з сабой. Больш сюды іх не вярталі...

С. КАЖАДУБ.
Івацэвіцкі раён.
(Заканчэнне будзе).





Вера Розіна (50-я гады).



Марыя Кірыенка з сынам Пецем (1945 г.).



Пляц у Падстарыні, ля якога стаяў будынак, дзе дапытвалі і катавалі мясцовых жыхароў.
Фота А. ГАНЧУКА.

Для дома, для семьи, для души...



КОПИЛКА ОПЫТА

Цвет в интерьере

Зеленый цвет

Для дома: оказывает длительное воздействие на глаза и нервную систему. Зеленый "оазис" на подоконнике, зеленые обои и ковры снимают усталость и напряжение.

Для офиса: идеальный цвет для мест отдыха — кафе, столовых, комнат отдыха и т. п. Можно использовать пастельно-зеленый для окраски стен, в виде зеленых растений, зеленых кресел для отдыха и т. п.

Серый цвет

Для дома: серый нужно использовать очень осторожно, так как он имеет тенденцию угнетать активность и снижать эффективность деятельности.

Для офиса: обостряет критичность, рассудительность и скрытность, показан как цвет мебели, кроме того, если вам предстоят серьезные переговоры, будет неплохо "спрятаться" за элегантным серым костюмом.

Бирюзовый цвет

Для дома: помогает бороться с электромагнитным излучением, поэтому очень полезно ставить телевизор у бирюзовой стены. Бирюзовый цвет помогает выразить свои мысли, особенно застенчивым людям, поэтому хорош в местах, где много пишут или говорят. Например, на письменном столе, у телефона.

Для офиса: полезен как основной цвет защитного экрана компьютера, так как ощутимо снижает вредоносные излучения. В офисах, где приходится много общаться, заключать различные сделки, вести переговоры, стены можно оформить в бирюзовых тонах, это повысит "говорливость" и сделает переговоры более эффективными.

Коричневый цвет

Для дома: коричневая деревянная мебель, коричневые стулья и ковры дают человеку интенсивное чувство защищенности и надежности. В детской можно устроить уютный уголок с коричневым ковриком, где малыш будет чувствовать себя в полной безопасности. Но будьте осторожны! Много коричневого ведет к блокированию предприимчивости.

Для офиса: по возможности нужно исключить коричневый из профессионального обихода, поскольку он угнетает любую творческую и мыслительную деятельность. Немного коричневого можно использовать в детских садах и яслях для оформления уголка для игр.

Золотистый цвет

Для дома и офиса: "Золотые" рамы зеркал и картин, золотистое свечение плетенных из соломки и лозы вещей, золотое пламя свечи помогут создать в вашей квартире и офисе благородную и уютную атмосферу.

Серебристый цвет

Для дома и офиса: энергия серебристого цвета (рамы картин и зеркал, украшения) помогут открыть в себе новые источники сил, когда вы почувствуете себя "выжатым, как лимон". Благоприятная энергия серебристого цвета восстановит ваши силы.

Персиковый цвет

Для дизайна очень хорош интенсивный персиковый цвет, дающий ощущение юности и целительно влияющий на состояние кожи. Цвет должен быть чистым и нежным, затемненный персиковый помешает после пробуждения почувствовать себя свежим и обновленным.

ХОЗЯЙКЕ НА ЗАМЕТКУ

Салаты из свежей капусты

3 кг капусты (нашинковать), 3 кг помидоров (нарезать дольками), 1,5 кг лука (нарезать колечками), 1,5 кг моркови (натереть на терке), 9 чайных ложек соли, 9 чайных ложек сахара, 100 г 9-процентного уксуса, 0,5 л подсолнечного масла.

Все перемешать, довести до кипения. Выложить в банки и закрыть крышками.



XXX

Капусту нашинковать и сложить в банку. В небольшом количестве холодной кипяченой воды растворить 2 ст. ложки соли, 4 ст. ложки сахара, 50 г уксуса и влить в банку с капустой. Затем долить водой до горловины, накрыть крышкой и поставить стерилизовать 45 минут. Закатать.

XXX

5 кг капусты, 1 кг моркови, 1 кг лука и 1 кг сладкого перца.

Овощи измельчить ножом или на терке, сложить в большой таз, посыпать солью и сахаром, добавить уксус и подсолнечное масло. Для этого необходимо 350 г сахара, 4 ст. ложки соли, 0,5 л 9-процентного уксуса и 0,5 л растительного масла. При приготовлении этого салата отсутствует тепловая обработка. Все овощи осторожно перемешайте в тазу, стараясь не помять капусту, иначе они преждевременно выделят сок. Разложите салат в чистые трехлитровые банки, хорошо утрамбуйте деревянной скалкой. Через три дня закройте банки капроновыми крышками и поставьте в холодное место. Ассорти долго хранится и не теряет вкуса.

XXX

3 кг капусты, 3—4 моркови, 2 головки чеснока. Капусту разрезать на 6—8 частей с кочерыжкой. Сложить в глубокую посуду слоями, пересыпая капусту морковкой и чесноком.

Влить 3/4 стакана подсолнечного масла. Приготовить маринад: 1,5 л воды, 1 ст. сахара, 4 ст. ложки соли с верхом, 250 г уксуса, закипятить. Залить маринадом капусту и под гнет. Через пару дней капуста готова.

XXX

2 кг капусты, 1 головка чеснока, 1 средняя свекла, морковь (по вкусу).

Капусту нашинковать, свеклу и морковь натереть на терке, чеснок измельчить. Сложить овощи в кастрюлю, всыпать 2 столовые ложки соли, дать настоять 2—3 часа. Затем закипятить маринад и залить им капусту. Через несколько дней можно подавать к столу.

Маринад: 1 л воды, 1 стакан подсолнечного масла, 1 стакан сахара, 1 ст. ложка соли, 0,5 стакана уксуса.

ГЭТА ЦІКАВА

Жыццёвая арыфметыка

